Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

10 СТУДЗЕНЯ 2009 г.
СУБОТА
№ 3
(26361)

Кошт 550 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

ЧАС ПАДАВАЦЬ ДЭКЛАРАЦЫЮ...

Сёлета падаць дэкларацыю аб сукупным гадавым даходзе за 2008 год неабходна да 2 сакавіка ўключна, паведамілі рэдакцыі ў прэс-цэнтры Міністэрства па падатках і зборах. Павінны даць адпаведную справаздачу тыя асобы, якія атрымлівалі на працягу мінулага года даходы ад фізічных асобаў, якія не з'яўляюцца падатковымі агентамі. Дэклараванню падлягаюць даходы ад платнага адчужэння на працягу 5 гадоў больш як адной кватэры, дачы, садовага доміка, гаража і зямельнага ўчастка, а таксама ад продажу на працягу года больш як аднаго аўтамабіля ці іншага транспартнага сродку. Дэкларуюцца даходы ад платнага адчужэння аб'ектаў нерухомай маёмасці, што адносяцца да нежылых памяшканняў і ад продажу іншым фізічным асобам каштоўных папераў і фінансавых інструментаў тэрміновага рынку, напрыклад, ад рэалізацыі імянных прыватызацыйных чэкаў «Маёмасць» і «Жыллё». Дэкларацыю павінны падаць тыя плацельшчыкі, якія атрымлівалі летась даходы з крыніц за межамі Беларусі ў тым выпадку, калі яны знаходзіліся на тэрыторыі нашай краіны больш як 183 дні ў каляндарным годзе. Тым работнікам, якія мелі некалькі крыніц падаткаабкладаемага даходу, сёлета дэкларацыю падаваць не трэба, бо такія даходы не па месцы асноўнай працы летась абкладаліся падаходным падаткам па стаўцы 15 працэнтаў. Фізічныя асобы могуць падаць падатковую дэкларацыю, калі на працягу года яны мелі права, аднак не скарысталіся ці скарысталіся не ў поўным аб'ёме стандартнымі сацыяльнымі, маёмаснымі вылікамі і (або) маюць права на атрыманне прафесійнага падатковага выліку.

Сяргей КУРКАЧ.

Прэзідэнт Беларусі разгледзеў кадравыя пытанні

Прэзідэнт Беларусі 9 студзеня разгледзеў кадравыя пытанні.

Кіраўнік дзяржавы назначыў:

Пяткевіч Наталлю Уладзіміраўну — першым намеснікам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі,

Снапкова Мікалая Генадзьевіча — намеснікам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі,

Чаканава Валянціна Сяргеевіча — міністрам гандлю,

Чыжыка Сяргея Антонавіча — галоўным вучоным сакратаром Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі,

Курыльца Анатоля Адамавіча — намеснікам міністра ўнутраных спраў — начальнікам галоўнага ўпраўлення кадраў (статс-сакратаром).

Прэзідэнт даў згоду на назначэнне:

Гутарава Віктара Сяргеевіча — старшынёй Пастаўскага райвыканкама,

Булая Уладзіміра Уладзіміравіча — старшынёй Чашніцкага райвыканкама,

Сітніцы Аляксандра Міхайлавіча — старшынёй Гомельскага райвыканкама,

Процыка Мікалая Іванавіча — старшынёй Ельскага райвыканкама,

Вялічкі Алега Валянцінавіча — кіраўніком адміністрацыі Савецкага раёна г. Гомеля,

Казялкова Барыса Мікалаевіча — старшынёй Гродзенскага гарвыканкама,

Паўлюкевіча Іосіфа Восіпавіча — старшынёй Слонімскага райвыканкама,

Малашкі Валерыя Анатольевіча — намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама,

Вашчылы Францішка Вітольдавіча — старшынёй Клічаўскага райвыканкама,

Бойкі Аляксандра Анатольевіча — старшынёй Шклоўскага райвыканкама,

Мірановіча Уладзіміра Уладзіміравіча — старшынёй Барысаўскага райвыканкама,

Чачухі Сцяпана Уладзіміравіча — старшынёй Старадарожскага райвыканкама,

Білейчыка Аляксандра Уладзіміравіча — першым намеснікам міністра юстыцыі,

Бадак Алы Мікалаеўны — намеснікам міністра юстыцыі,

Кісялёва Сяргея Антонавіча — намеснікам міністра фінансаў,

Алейніка Сяргея Фёдаравіча — намеснікам міністра замежных спраў з захаваннем функцый Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Беларусі пры Святым Прастоле, Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Беларусі пры Суверэнным Ваенным Ордэне Гаспітальераў Святога Іаана Іерусалімскага, Родаса і Мальты,

Марчанкі Анатоля Сцяпанавіча — генеральным дырэктарам Беларускага дзяржаўнага аб'яднання арганізацыі бытавога абслугоўвання насельніцтва,

Мышкаўца Сяргея Іванавіча — намеснікам генеральнага пракурора Беларусі,

Максімава Васіля Міхайлавіча — членам Віцебскага аблвыканкама,

Трухана Руслана Іванавіча — членам Мінскага аблвыканкама.

Назначаючы першага намесніка і намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што найважнейшым пытаннем застаецца работа з кадрамі і ідэалогія.

Наталлі Пяткевіч даручана ўзяць пад свой кантроль усю ідэалагічную работу ў краіне, якая ёй добра вядома. Прэзідэнт паўтарыў сваё галоўнае патрабаванне да гэтай работы — не дапускаць фармальнага падыходу. «Ніякага фармалізму, ніякай балбатні, як гэта бывае на адзіных днях інфармавання. Гэта горш, чым наогул нічога не рабіць!» — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Ён таксама паставіў задачу звярнуць асаблівую ўвагу на работу сродкаў масавай інфармацыі. «Тут намеціўся нейкі спад, калі не сказаць застой у асобных СМІ», — заўважыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка таксама паставіў пэўныя задачы кіраўніку Адміністрацыі Уладзіміру Макею. «Адміністрацыя павінна памяняць стыль сваёй работы. Яна павінна стаць сапраўдным штабам Прэзідэнта», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Пры гэтым Адміністрацыя не павінна «цягнуць» замест іншых дзяржорганаў некаторыя іх функцыі, выпраўляючы чужыя недапрацоўкі. Неабходна таксама жорстка ставіць пытанне аб адпаведнасці кадраў займаемым пасадам, калі ўносімыя імі кіраўніку дзяржавы прапановы або дакументы прапрацаваны вельмі няякасна, а кандыдатуры, што прадстаўляюцца для назначэння на адказныя пасады, не падыходзяць па іх дзелавых або маральных якасцях.

Кіраўнік дзяржавы паставіў перад Міністэрствам гандлю задачу больш актыўна праводзіць работу як па насычэнні ўнутранага рынку, так і па прасоўванні на знешнія рынкі тавараў айчыннай вытворчасці, развіцці тавараправаднай сеткі. Прэзідэнт таксама даручыў прааналізаваць работу Мінгандлю ў цэлым і магчымасць пашырэння яго функцый.

У размове з новымі кіраўнікамі мясцовых выканаўчых органаў Прэзідэнт падкрэсліў: «Вам аказаны вялікі давер. Але і адказнасць за работу на гэтых важных пасадах будзе вельмі жорсткая». Ён дадаў: «Гледзячы на вас, народ будзе меркаваць аб уладзе. Не дапушчальныя нават самыя малыя праявы карупцыі! Удзяляйце значную ўвагу кадрам: спраўляюцца людзі — падтрымлівайце, не цягнуць — няхай ідуць працаваць па спецыяльнасці».

Кіраўнік дзяржавы заявіў, што часу на разварушванне няма. «Пяцігодка практычна заканчваецца. І якія б у свеце крызісы не палалі, адкату назад быць не павінна. Невыкананне гэтай пяцігодкі азначае невыкананне наступнай. Галоўная задача — 2010 год завяршыць так, каб пяцігодка была не толькі выканана, але і перавыканана», — сказаў Прэзідэнт.

Паводле яго словаў, сёння неабходна ствараць нармальныя ўмовы для работы суб'ектаў гаспадарання, асабліва ў вытворчай сферы. У ліку прыярытэтаў — нарошчванне беларускага экспарту і максімальнае імпартазамяшчэнне. «Пастаўлена важная задача: усё выпушчанае ў Беларусі павінна быць прададзена. Трэба выходзіць на новыя рынкі па ўсіх напрамках, неабходна захаваць вытворчасць і рабочую сілу. Таму што сусветны крызіс не бясконцы, і калі ён скончыцца, то вытворчасць будзе запатрабавана», — перакананы Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт зноў акцэнтаваў увагу на тым, што развіццё імпартазамяшчэння — адна з важнейшых задач мясцовай вертыкалі. «Завозіць тавары народнага спажывання — гэта злачынства. Усё трэба вырабляць у сябе», — дадаў ён.

Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў ад кіраўнікоў мясцовых выканаўчых органаў няўхільнага выканання Дырэктывы № 3, накіраванай на ўкараненне ў краіне прынцыпаў эканоміі і беражлівасці.

Аляксандр Лукашэнка пацвердзіў, што ў Беларусі не адмовяцца ад рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі. «Гэту праграму мы будзем фінансаваць па ўсіх напрамках. Але ўлічыце, што кантроль за рэалізацыяй дакумента будзе ўзмоцнены: мы будзем кантраляваць, наколькі эфектыўна ўкладзены кожны рубель. Навядзіце парадак з расходаваннем сродкаў, забяспечце нармальнае будаўніцтва аграгарадкоў і ўсёй неабходнай інфраструктуры. Усе ўзведзеныя дамы павінны быць заселены. І вельмі важна не адрываць будаўніцтва аграгарадкоў ад вытворчых аб'ектаў», — заявіў Прэзідэнт.

Таксама ў Беларусі ні ў якім выпадку не будзе згорнута праграма развіцця малых і сярэдніх гарадоў. З улікам таго, што 2009 год аб'яўлены Годам роднай зямлі, на першы план выходзіць добраўпарадкаванне гарадоў, вёсак, дарог і прылеглых зямель. «Навядзіце ўсюды ідэальны парадак, у гарадах, вёсках. Катэгарычна забараніць вывозіць у лясы смецце і хлам!» — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Акрамя таго, як падкрэсліў Прэзідэнт, кіраўнікам мясцовых выканаўчых органаў неабходна засяродзіць намаганні на стварэнні вытворчасцяў, арыентаваных на мясцовыя рэсурсы, што дасць магчымасць павысіць занятасць насельніцтва, палепшыць эканоміку рэгіёнаў.

У 2009 годзе будзе святкавацца 65-я гадавіна вызвалення Беларусі ад фашызму. «Да гэтай падзеі неабходна дастойна падрыхтавацца. Як бы ні было складана, мы павінны прадэманстраваць, што гераічны подзвіг нашага народа будзе шанавацца заўсёды», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў ад чыноўнікаў усяляк выкараняць бюракратызм, асабліва калі размова ідзе аб вырашэнні пытанняў абароны і падтрымкі сям'і.

Кіраўнік дзяржавы таксама закрануў і сітуацыю, што ўзнікла на валютным рынку краіны. Аляксандр Лукашэнка заклікаў людзей да спакою: «Усе задаюцца пытаннем — а як далей будзе? Далей будзе нармальна. Бегчы ў абменнікі не трэба. Скажу шчыра: дэвальвацыя нацыянальнай валюты на 20 працэнтаў адбылася па дзвюх прычынах. Па-першае, Расія — наш буйны гандлёвы партнёр, і нашы экспарцёры пры моцным беларускім рублі пачалі несці вялікія страты пры гандлі на яе рынках. Таму давялося пайсці на такі крок. І лепш было правесці дэвальвацыю за адзін раз. Кошт долара ў сярэднім вырас на 400 рублёў, гэта параўнальна няшмат, але мы падтрымалі работнікаў вытворчасці. Галоўнае цяпер — вытворчасць, бо будзе вытворчасць — будзе і рубель, будзе ўсё. Не будзе вытворчасці — не будзе і рубля. Па-другое, Міжнародны валютны фонд прапанаваў Беларусі добры крэдыт, нават лепшы, чым дала Расія. Але было два патрабаванні: не павышаць заработную плату, не раздаваць беларускія рублі, таму што народ пойдзе мяняць іх на долары ў абменніках (хоць мы не зусім згадзіліся, але знайшлі кампраміс), і другое — каб мы на 20 працэнтаў разава дэвальвавалі рубель. Гэта было патрабаванне МВФ. І амаль за тры мільярды долараў, якія яны нам прапанавалі, на гэта трэба было ісці. Тым больш, што дэвальвацыю нам трэба было і так ажыццяўляць з-за нашай экспартаарыентаванай эканомікі», — заявіў Прэзідэнт.

Паводле словаў кіраўніка дзяржавы, беларусам не трэба «бегчы ў абменнікі і купляць па шалёных цэнах долары». «Невядома, што яшчэ будзе з доларам і еўра. Калі нехта хоча ўкласці свае грошы ў тавары — гэта правільна. Але купляць тры, пяць, дзесяць тэлевізараў або халадзільнікаў з разлікам на тое, што гэта добрае ўкладанне сродкаў, — гэта поўнае глупства, таму што цэны на тавары падаюць. Грошы трэба трымаць у банках», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт лічыць, што ў далейшым сітуацыя стабілізуецца. «Мы нават разлічваем, што нам трэба будзе ўмацоўваць рубель, а долар стане таннейшы. Будзе ўсё залежаць ад насельніцтва і ад таго, як будзе складвацца сітуацыя на рынку. І потым, у Беларусі ўсе ж за рубель жывуць, ды мы і цяпер павышаем прывабнасць нашай валюты. Галоўнае — вытворчасць і продаж тавараў, трэба шукаць рынкі і прадаваць прадукцыю», — сказаў на заканчэнне Прэзідэнт.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*Напэўна гэта лёс, калі прафесія адпавядае прозвішчу. Кавалёвы павінны займацца кавальскай справай, Рыбаковы — лавіць рыбу. А Людміла Іванаўна Каравай з Жодзіна — ведаць толк у пірагах і караваях. Што, уласна кажучы, яна шмат гадоў з поспехам і дэманструе. Але ў яе жыцці гэткае спалучэнне адбылося з дакладнасцю наадварот. Спачатку набыла прафесію, а прозвішча атрымала пазней — ад мужа. І гэта, як ні круці — стопрацэнтная адпаведнасць. Магчыма таму жодзінскія тарты, рулеты і нават звычайныя школьныя булачкі карыстаюцца нязменным попытам у гараджан. А якія вясельныя каравai выпякаюць на жодзінскім камбінаце грамадскага харчавання, дзе інжынерам-тэхнолагам працуе Людміла Каравай! І духмяныя, і прыгожыя, і смачныя! Кулінарнае мастацтва — інакш і не скажаш. Зразумела, толькі ў любові да працы хаваецца галоўны сакрэт поспеху. Людміла прызнаецца, што гэтай любоўю яна шчодра надзелена. Але праца ў сферы харчавання яшчэ і вельмі адказная, тым больш што жодзінскія харчавікі абслугоўваюць дзесяць гарадскіх навучальных устаноў. **Людміла КАРАВАЙ** кантралюе якасць харчавання, распрацоўвае новыя стравы. Апроч таго ёй даводзіцца вывозіць вырабы свайго прадпрыемства на кірмашы, станавіцца за прылавак. Як гэта было нядаўна на адным з кірмашоў сталіцы (на фотаздымку).*

Біяграфія ПЯТКЕВІЧ Наталлі Уладзіміраўны

Пяткевіч Наталля Уладзіміраўна нарадзілася ў 1972 годзе ў Мінску. У 1994 годзе скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Кандыдат юрыдычных навук. У 1994-2001 гадах займала пасады вядучага спецыяліста аддзела дзяржаўнага права, галоўнага спецыяліста, саветніка-кансультанта, загадчыка аддзела дзяржаўнага і міжнароднага права дзяржаўна-прававога ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, начальніка ўпраўлення дзяржаўнага і міжнароднага права, намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення — начальніка ўпраўлення дзяржаўнага і міжнароднага права галоўнага дзяржаўна-прававога ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта. У 2001-2004 гадах была прэс-сакратаром Прэзідэнта Беларусі.

З лістапада 2004 года працавала намеснікам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта. 9 студзеня 2009 года Наталля Пяткевіч назначана першым намеснікам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

Узнагароджана медалём «За працоўныя заслугі».

Біяграфія СНАПКОВА Мікалая Генадзьевіча

Снапкоў Мікалай Генадзьевіч нарадзіўся ў 1969 годзе ў Магілёве. У 1991 годзе скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію, у 2001 годзе — Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. З'яўляецца дэпутатам Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў. Пачынаў працоўную дзейнасць у 1986 годзе рабочым рамонтнай майстэрні саўгаса «Трасціно» Хоцімскага раёна Магілёўскай вобласці. З 1990 года працаваў эканамістам племзавода «Леніна» Горацкага раёна Магілёўскай вобласці, затым — эканамістам Гродзенскай кантрольна-выпрабавальнай станцыі па свінагадоўлі, старшым эканамістам ЭВСА «Піса-раўшчына» Мсціслаўскага раёна Магілёўскай вобласці. З 1992 па 1994 год Мікалай Снапкоў працаваў бухгалтарам Дрыбінскага раённага ВА ЖКГ Магілёўскай вобласці. З 1994 па 1996 год — эканаміст, галоўны эканаміст крэдытнага аддзела, намеснік кіраўніка Дрыбінскага аддзялення «Белаграпрамбанк» Магілёўскай вобласці. З 1996 па 2000 год — намеснік старшыні па пытаннях эканомікі, рыначных адносінаў і прыватызацыі Горацкага райвыканкама. З 2000 па 2007 год — начальнік фінансавага ўпраўлення Магілёўскага аблвыканкама. З 2007 года працаваў намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама. 9 студзеня 2009 года назначаны намеснікам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Біяграфія ЧАКАНАВА Валянціна Сяргеевіча

Фота БЕЛТА.

Чаканаў Валянцін Сяргеевіч нарадзіўся 29 красавіка 1957 года ў горадзе Бабруйску Магілёўскай вобласці. У 1982 годзе скончыў Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя В.У. Куйбышава, у 1991 годзе — Інстытут палітalогіі і сацыяльнага кіравання Кампартыі Беларусі, у 2002 годзе — Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Беларусі.

З 1978 па 1990 год працаваў у структуры камсамола. З 1990 па 1993 год быў эканамічным саветнікам, загадчыкам аддзела гандлю Бабруйскага гарвыканкама. У 1993 годзе ўзначаліў ААТ «Космас-Камцэнтр» у Бабруйску.

У 2001—2002 гадах працаваў намеснікам дырэктара, дырэктарам ТАА «Прамгандальскура», намеснікам начальніка дзяржаўнай установы матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Беларусі.

З 2002 года быў намеснікам генеральнага дырэктара ААТ «Белбакалея», а потым узначаліў гэта прадпрыемства.

9 студзеня 2009 года Валянцін Чаканаў назначаны міністрам гандлю Беларусі.

Па адным-два хутары плануецца стварыць у 2009 годзе ў кожным рэгіёне Беларусі

Пра гэта паведаміў карэспандэнту БЕЛТА міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Сямён Шапіра.

Мінсельгасхарч гарантуе выдзяленне зямельных участкаў тым, хто жадае жыць на хутары і весці хатнюю гаспадарку. Акрамя таго, на дзяржаўным узроўні прадугледжана аказваць садзейнічанне будучым уладальнікам хутарскіх гаспадарак у будаўніцтве жылля, пракладцы лініі электрапередач. І хоць юрыдычны статус уладальніка хутара яшчэ не вызначаны, цікавасць да новай формы вядзення сельскай гаспадаркі ўжо ёсць. Многія гараджане хочуць мець домік у вёсцы, каб займацца экатурызмам. Магчыма, гэты заходні вопыт у хутарской гаспадарцы будзе найбольш прымальны, лічыць міністр. «Галоўная мэта, якую маюць арганізатары стварэння хутароў, — даць людзям права асэнсаваць выбар: жыць у вёсцы, на хутары або ў аграгарадку».

БЕЛТА.

Грошы

«Валюты хопіць усім...»

Ужо ў найбліжэйшы час праблема з дэфіцытам валюты ў абменных пунктах павінна быць знятая, паведамiў карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар Нацыянальнага банка Беларусі Міхаіл Журавовіч.

Пра тое, што ў «абменніках» не заўсёды хапае цвёрдаканверсоўнай, каб задаволіць ажыятажны попыт насельніцтва на яе, мы ўжо паведамлялі. Нягледзячы на тое, што пункты абмену падмацоўваюцца валютай, усім ахвотным купіць долары пакуль што гэтага зрабіць не ўдаецца. Паводле словаў прэс-сакратара, цяперашняя сітуацыя — не вынік нястачы валюты ў банках. Проста неабходна некалькі дзён на вырашэнне тэхнічных пытанняў, звязаных з закупкай і завозам валюты. Да таго ж, хутчэй за ўсё, для банкаў было нечаканасцю, што пасля істотнага росту курсу долара і еўра людзі раптоўна кінуцца скупляць гэтую замежную валюту. Каб выправіць становішча, галоўным банкам дадзена камерцыйным указанне, згодна з якім яны павінны забяспечваць абменныя пункты валютай на працягу ўсяго дня — да закрыцця. Тым больш што, зазначыў прэс-сакратар, у Нацбанка хапае валюты і ён гатовы прадаваць яе камерцыйным банкам у неабходным аб'ёме. Міхаіл Журавовіч таксама ў чарговы раз падкрэсліў, што ў выніку ажыятажу людзі на канвертацыі могуць страціць больш, чым набываюць. У прыватнасці, нагадаем, што калі ў чацвер банкі прадавалі наяўны долар ЗША па курсе 2 708 рублёў за 1 долар, то ўчора, пасля таго як 8 студзеня на таргах Беларускай валютна-фондавай біржы курс рубля да долара ўмацаваўся на 10 рублёў, набыць «амерыканца» ў «абменніку» ўжо можна было за 2693 рублі.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.01.2009 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 645,00
1 еўра	3 611,75
1 латвійскі лат	5 101,75
1 літоўскі літ	1 045,45
1 чэшская крона	136,53
1 польскі злоты	890,03
1 расійскі рубель	90,16
1 украінская грыўня	326,34

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў
Цэнтрабанк РФ

USD	29,3916
10 UAH	38,2952
1000 BYR	13,3537
EUR	41,4275

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.
ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова»
УНП 100024047
Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806
выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

ISSN 1990 - 763X

Лаўрэатамі прэміі «За духоўнае адраджэнне» ўпершыню сталі ўрачы і прыёмныя бацькі

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 8 студзеня ўручыў прэміі «За духоўнае адраджэнне» і спецыяльныя прэміі Кіраўніка дзяржавы дзеячам культуры і мастацтва 2008 года.

Гэтыя ўзнагароды, заснаваныя больш як дзесяць гадоў таму, сведчаць пра дзяржаўнае прызнанне заслуг навуковай і творчай інтэлігенцыі, тых, хто асабліва вылучыўся ў гуманітарнай і дабрачыннай дзейнасці.

Прафесійны і тэматычны дыяпазон пры вылучэнні прэтэндэнтаў на прэмію «За духоўнае адраджэнне» на гэты раз быў значна пашыраны. Ён уключаў не толькі майстроў культуры і духавенства, але і прадстаўнікоў іншых, вельмі важных сфераў у жыцці грамадства. Як падкрэсліў Прэзідэнт, лаўрэаты прэміі працуюць у розных сферах, але «ўсе служаць адзінай мэце — ажыццяўленню высокіх ідэалаў гуманізму».

Упершыню лаўрэатамі прэміі «За духоўнае адраджэнне» сталі ўрачы і прыёмныя бацькі. Узнагародай адзначаны супрацоўнікі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра дзіцячай анкалогіі і гематалогіі і сям'я Онахавых з Пружанскага раёна, якая выхоўвае 8 дзяцей, як родных, так і прыёмных.

На думку кіраўніка дзяржавы, гэта красамоўна сведчыць аб духоўным абнаўленні грамадства, у якім адным з найважнейшых прыярытэтаў з'яўляецца ўсебаковая падтрымка мацярынства і дзяцінства. «Бо клопат аб дзецях — залог упэўненай будучыні нашай краіны», — сказаў ён.

Традыцыйна ўручаючы прэміі ў калядныя дні, Прэзідэнт адзначыў, што гэта светлае свята, з якім звязваюць надзеі на абнаўленне, пераўтварэнне навакольнага свету і чалавечай душы, набывае асаблівы сэнс у гэты год, аб'яўлены ў краіне Годам роднай зямлі. «Зямля — гэта не толькі тэрыторыя і прыродныя рэсурсы, а яшчэ і бацькоўскі дом, сям'я, дзеці, традыцыі, звычаі і маральныя ідэалы народа, яго самабытная культура, багатая, гераічная гісторыя — усё, што аб'ядноўваецца вялікім і ёмістым паняццем — Айчына», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Ён нагадаў, што ў гэтым годзе Беларусь будзе адзначаць 65-ю гадавіну вызвалення ад нямецка-фашысцкай акупацыі, немалаважную ролю ў якім адыграла і Праваслаўная царква, падтрымліваючы, прасвятляючы і выхоўваючы ў духу любові да Айчыны. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што і сёння яна з'яўляецца надзейным памочнікам ва ўмацаванні грамадзянскага міру і згоды ў грамадстве, сацыяльным служэнні і маральным узвышэнні асобы.

Уладальнікамі прэміі «За духоўнае адраджэнне» таксама сталі аўтарскі калектыў дзесяцітомнага выдання «Беларусы» Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН, протаіерэй, настаяцель прыхода храма прападобнага Серафіма Сароўскага ў Мінску Аляксандр Шырытон.

Спецыяльнай прэміі кіраўніка дзяржавы ўдастоены 12 майстроў культуры, творчыя калектывы, школы мастацтваў, музеі і бібліятэкі. «Тыя, хто сваю творчую энергію і сілы накіроўвае на высакародную справу — стварэнне маральных і эстэтычных каштоўнасцяў, выхаванне адоранай моладзі, зацвярджэнне ідэалаў чалавечнасці, дабра і міласэрнасці», — сказаў Прэзідэнт.

Звяртаючыся да прысутных, Аляксандр Лукашэнка пажадаў, каб «добрыя справы лаўрэатаў сталі прыкладам для ўсіх людзей, натхнілі на дапамогу дзецям, на ўвагу да абяздоленых і ўсіх тых, хто мае ў ёй патрэбу».

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ЗВЯЗДОЎСКІМ ПРЫЗАМ — ШЫРОКУЮ ГЕАГРАФІЮ

Як мы і абяцалі, у сённяшнім нумары газеты друкуем спісы шчасліўчыкаў звяздоўскага розыгрышу па выніках падпіскі на 1-е паўгоддзе 2009 года.

Вельмі прыемна адзначыць, што колькасць падпісчыкаў застаецца стабільнай, а гэта азначае, што людзі паважаюць і любяць «Звязду», якой сёлета споўніцца 92 гады. Сапраўдныя звяздоўцы не перасталі верыць ва ўдачу і даслалі даволі шмат запоўненых купонаў. Са свайго боку рэдакцыя газеты пастаралася, каб задаволіць максімум патрэбаў у прызавым фондзе, выставіўшы на кон звыш трох дзясяткаў прызоў, сярод якіх халадзільнік «Атлант», 7 каляровых тэлевізараў «Віцязь», мікрахвалевая печ-ЗВЧ, а таксама шэраг іншых каштоўных прызоў са звяздоўскай сімволікай...

Вось як канчаткова размеркаваўся ўвесь прызавы фонд па выніках падпіскі на газету «Звязда» на 1-е паўгоддзе 2009 года.

Майка з фірменным лагатыпам «Звязды»

КУРБЕКА Алена Віктараўна, в. Малая Сваротава, Баранавіцкі раён.

ШАКЯЛЕЎСКАЯ Ніна Дзмітрыеўна, в. Пятровічы, Шаркаўшынскі раён.

ЛІСЕЕНКА Галіна Аляксандраўна, г. Мазыр.

РЫПІНСКІ Уладзімір Мікалаевіч, в. Сынкавічы, Зэльвенскі раён.

БОРМАТАВА Фаіна Іванаўна, г. Чавусы.

ЖУК Анатоль Уладзіміравіч, г. Слуцк.

КАЗБЯРУК Уладзімір Міхайлавіч, г. Мінск.

Бейсболка з фірменным лагатыпам «Звязды»

ЛЕВАНЧУК Марыя Васільеўна, в. Полкацічы, Іванаўскі раён.

ГАРБАЧОЎ Мікалай Уласавіч, в. Сінягорская, Сенненскі раён.

ГУЛЯЙ Віктар Станіслававіч, г. Мазыр.

БАХАР Канстанцін Паўлавіч, в. Брольнікі, Навагрудскі раён.

ФЕАКЦІСТАВА Валянціна Аляксандраўна, г. Асіповічы.

МАЛЕВІЧ Кіра Аляксандраўна, в. Крывічы, Мядзельскі раён.

СУЧКО Сцяпан Васільевіч, г. Мінск.

Настольны гадзіннік з фірменным лагатыпам «Звязды»

МАСЛОЎСКІ Міхаіл Іванавіч, в. Любішчыцы, Івацэвіцкі раён.

ТЫШКО Іван Іванавіч, г. Віцебск.

АНДРУКЕВІЧ Зінаіда Іосіфаўна, пас. Гезгалы, Дзятлаўскі раён.

ГЕЦАРАВА Ніна Афанасьеўна, в. Бярозаўка, Слаўгарадскі раён.

БУЛДА Пётр Сцяпанавіч, в. Камянец, Мінскі раён.

ДУНЯК Ірына Тадэвушаўна, г. Мінск.

Каляровы тэлевізар «Віцязь»

РЫБАЛТОЎСКІ Казімір Пятровіч, в. Паланечка, Баранавіцкі раён.

КАЗЛОВА Алена Еўдакімаўна, в. Ст. Запалоўе, Глыбоцкі раён.

ШЭЎЧУК Раіса Варфаламееўна, в. Меркулавічы, Чачэрскі раён.

ІГОЛКА Людміла Аляксандраўна, г. Зэльва.

АНАНІЧ Людміла Аляксандраўна, г. Чэрыкаў.

СПІРЫДОВІЧ Вера Браніславаўна, г.п. Івянец, Валожынскі раён.

СУШКО Фёдар Парфёнавіч, г. Мінск.

Мікрахвалевая печ-ЗВЧ

ДУБРОЎСКАЯ Марыя Канстанцінаўна, г. Капыль.

Халадзільнік «Атлант»

ЖЭРАЎЧУК Іван Іванавіч, г. Барысаў-15.

Яшчэ раз віншуем усіх падпісчыкаў, каму ўсміхнулася ўдача. Спадзяёмся, што ў наступны раз яна ўсміхнецца тым, каму цяпер не пашанцавала.

Прыносім прабачэнні тым падпісчыкам, калі раптам у спісы ўкралася недакладнасць, бо не ўсе купоны запоўнены разборліва.

Свае прызы, паважаныя сябры, можна атрымаць ў рэдакцыі газеты «Звязда», пачынаючы з сённяшняга дня (кант. тэлефон — 8-017-287-17-79). Праўда, супергрызы — халадзільнік, мікрахвалевую печ-ЗВЧ і тэлевізары «Віцязь» супрацоўнікі газеты даставяць нашым шчасліўчыкам асабіста па месцы жыхарства і ўручаць іх у час бліжэйшай падпісной кампаніі пры непасрэдным ўдзеле кіраўніцтва мясцовай «вертыкалі» і супрацоўнікаў паштовай сувязі.

Удачы ўсім!

Кар. «Звязды».

P.S. Рэдакцыя газеты «Звязда» будзе і надалей празрыста і аб'ектыўна разыгрываць прызы сярод сваіх падпісчыкаў. Таму яшчэ раз нагадваем:

— не патрэбна наклейваць на паперу ці іншы шчыльны матэрыял запоўнены і падрыхтаваны да адпраўкі купон — да розыгрышу такія экзэмпляры не прымаюцца;

— прысылаць на розыгрыш неабходна толькі адну картку з указаннем неабходных звестак;

— сапраўдныя тыя купоны, якія запоўнены ўласнаручна;

— з розыгрышу выключаюцца пустыя ці не да канца запоўненыя карткі.

Паважаныя сябры! Вялікая просьба запаўняць купоны на роднай беларускай мове.

Абзац

■ 10 студзеня ў 19.30 у сталічным Архікафедральным саборы Праабражэння Гасподняга (плошча Свабоды, 9) пройдзе святочны навагодні канцэрт арганнай музыкі, які праводзіцца пры падтрымцы пасольства Германіі ў Беларусі. Уваход на канцэрт вольны.

■ **Дзяржаўтаінспекцыя Мінска просіць грамадзян па магчымасці адмовіцца ад выкарыстання асабістага транспарту ў сувязі з неспрыяльным надвор'ем — снегападамі, магчымым галалёдам.**

■ Упраўленнем КДБ па Брэсцкай вобласці спынена дзейнасць міжнароднай злачыннай групы, у якую ўваходзілі грамадзяне Беларусі, Украіны, Расіі і Германіі. Па несапраўдных дакументах яны перамясцілі праз мытную мяжу Беларусі 27 пасажырскіх аўтобусаў. Сума неаплачанных мытных плацяжоў на ўвоз транспартных сродкаў склала каля 50 тыс. еўра за адзін аўтобус. Выяўлена, што садзейнічаў бесперашкоднаму ўвозу аўтобусаў па несапраўдных дакументах за грашовае ўзнагароджанне работнік пункта мытнага афармлення «Казловічы» Брэсцкай мытні. Узбуджана крымінальная справа, 4 з 27 аўтобусаў затрыманыя.

■ **У Зэльвенскім раёне школьнік пасля п'янкі забіў да смерці свайго сабутэльніка. Жыхара вёскі Малая Угрынь пабіў вучань 11 класа пасля сумеснага распіцця спіртных напояў. Падазроны затрыманы.**

■ 12 чалавек былі эвакуяваныя мінулай ноччу з-за моцнага задымлення пад'езда чатырохпавярховіка ў Барысаве. Пажар пачаўся ў 3-пакаёвай кватэры на першым паверсе, дзе пражывала сям'я з пяці чалавек. Гаспадар кватэры і яго сын выбраліся праз акно, на дапамогу астатнім прыйшоў экіпаж патрульна-паставой службы, які праязджаў міма. Прычынай НЗ стала кароткае замыканне электраправодкі.

■ **У Бешанковіцкім раёне школьнікі абрабавалі сейф дырэктара. Падабраўшы ключ да кабінета дырэктара, два дзевяцікласнікі скралі з незачыненага сейфа каля Br800 тыс. Абодва маюць судзімасці за крадзяжы. Цяпер ім пагражае да 7 гадоў пазбаўлення волі.**

■ У Тульскай вобласці ў выніку выбуху бытавога газу ў жылым доме адзін чалавек загінуў. Ім аказалася 100-гадовая жанчына. Усяго ў доме пражывала 46 чалавек.

Поўны абзац

■ **Амерыканскі хірург Рычард Баціста, які восем гадоў таму аддаў нырку хворай жонцы, пасля разводу запатрабаваў вярнуць яму перасаджаны орган. Са сваёй будучай жонкай ён пазнаёміўся ў 80-ыя гады, калі быў доктарам, а яна — медсястрой. У 1990 годзе яны пажаніліся, у пары нарадзіліся тры дачкі. Калі жонка захварэла, Рычард адразу даў згоду на перасадку ныркі. Аднак праз некаторы час сямейнае жыццё разладзілася, жанчына завяла каханка, забараніла былому мужу бачыцца з дзецьмі. Тады ён вырашыў вярнуць нырку ці атрымаць кампенсацыю за яе ў памеры 1,5 млн долараў. Эксперты, аднак, лічаць, што гэта наўрад ці ўдасца: па законе перасаджаная нырка лічыцца дарункам, і вярнуць яе немагчыма.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

«ДАВАЙЦЕ БЕЗ РЭЗКІХ РУХАЎ!»

Парламенцкі дзённік

Дэпутат Яўген АРЦЮШЭНКА раіць выбаршчыкам не дапускаць ажыятажных настрояў вакол набыцця замежнай валюты

Папраўкі ў закон аб валютным рэгуляванні і валютным кантролі абмяркоўвалі ўчора ў Палаце прадстаўнікоў на пасяджэнні рабочай групы. Пра новаўвядзенні журналістам распавёў **Яўген АРЦЮШЭНКА, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па грашова-крэдытнай палітыцы і банкаўскай дзейнасці:**

— Спрасціўся парадак продажу ў статутным капітале нашых прадпрыемстваў часткі гэтых прадпрыемстваў інвестарам. Відаць, новым момантам у гэтым законапраекце з'яўляецца тое, што ўводзіцца дазвальны парадак па даверным кіраванні сродкамі фізічных асобаў. Калі гэты законапраект будзе прыняты, прыватныя асобы пры накіраванні сваіх грашовых сродкаў за межы Рэспублікі Беларусь павінны будуць атрымаць адпаведны дазвол Нацыянальнага банка. Калі раней не патрабавалася атрымання дазволу па аперацыях, звязаных з рухам капіталу да 180 дзён, цяпер таксама неабходна будзе атрымліваць дазвол Нацыянальнага банка. Проста склалася практыка, калі фізічныя асобы прымалі рашэнні аб удзеле сваіх уласных грашовых сродкаў у паявых інвестыцыйных фондах, у асноўным на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі. Зразумела, што забараніць вывозіць гэтыя грашовыя сродкі мы не маем права, гэта пярэчыць Канстытуцыі, аднак паведаміць грамадзянам пра тое, што пэўныя аперацыі будуць насіць высокарызыкоўны характар, аб тым, што гэтыя здзелкі будуць утрымліваць пагрозу для самога ўкладчыка, органы дзяржаўнага кіравання, напэўна, павінны. Гэта норма ўводзіцца менавіта з такой мэтай. Не забараніць, а неяк больш растлумачыць, каб потым нашы грамадзяне не апынуліся ў нейкай нядобрай сітуацыі.

Законапраект — зразумела, праца на перспектыву. А людзей найперш турбуе тое, што адбываецца сёння. Многім з вас, відаць, даводзілася апошнім часам назіраць даўжэзныя чэргі ля абменнікаў. Сёй-той дальнабачны гаспадар набывае замежную валюту, а іншы, набраўшы яе раней, ужо здае — не ўсё ж запасаць, траціць, як ні круці, таксама давядзецца. **І ў гутарцы з Яўгенам Міхайлавічам журналісты не маглі абмінуць злабадзённае. Што раіць выбаршчыкам дэпутат?**

— Не трэба дапускаць ніякіх ажыятажных, панічных настрояў — тыя рашэнні, якія прымае Нацыянальны банк, на мой погляд, з'яўляюцца ўзважанымі і збалансаванымі, гэта рэакцыя на тую эканамічную сітуацыю, якая склалася ў нашай рэспубліцы ў сферы знешняга гандлю, у сферы руху капіталу. Таму я б не рабіў ніякіх рэзкіх крокаў, рэзкіх рухаў. Я зараз кантактую з прадстаўнікамі банкаў, і вельмі прыемна ўсведамляць, што ўклады насельніцтва ў банках не скарачаюцца. Мабыць, адбываецца ператок пэўных пазіцый, але гэта ўжо тэхнічныя пытанні. Таму ажыятажных настрояў мець не трэба, тым больш што на сёння, паводле гутарак з банкамі, якія непасрэдна займаюцца продажам валюты, у самы бліскі час, на мой погляд, гэтыя праблемы будуць знятыя.

Ала МАЧАЛАВА.

БЕЛОРУССКИЙ ИНДУСТРИАЛЬНЫЙ БАНК

Вниманию владельцев акций ОАО «Белорусский Индустриальный Банк»

ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» сообщает, что **19 января 2009 г.** состоится внеочередное Общее Собрание акционеров ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» в заочной форме путем письменного опроса с повесткой дня:

- об увеличении уставного фонда ОАО «Белорусский Индустриальный Банк»;
- о внесении изменений в Устав ОАО «Белорусский Индустриальный Банк»;
- о спонсорской и благотворительной деятельности.

Бюллетени для заочного голосования лица, имеющие право на участие в Общем Собрании акционеров ОАО «Белорусский Индустриальный Банк», могут получить, заполнить и предоставить по месту нахождения головного офиса ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» и его филиалов по следующим адресам:

г. Минск, ул. Мельникайте, 8;
г. Минск, ул. Энгельса, 30;
г. Витебск, ул. Чапаева, 16;
г. Гомель, ул. Головацкого, 19;
г. Гродно, бульвар Ленинского комсомола, 7а;
г. Могилев, пер. 2-й Крутой, 3а.

Срок окончания приема заполненных бюллетеней **16 января 2009 г.**

Информация по вопросам повестки дня предоставляется по указанным адресам лицам, имеющим право на участие в собрании, при предъявлении ими документов, подтверждающих личность и полномочия представителя.

Телефон для справок: т/ф (8 017) 209 41 85.

Наблюдательный Совет
ОАО «Белорусский Индустриальный Банк»

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 20 от 13.11.2008 г. УНП 100195493

...ЗНАЙСЦІ Ў ПРОДАЖЫ ХАЛАДЗІЛЬНІК СВАЁЙ МАРЫ

Рэпарцёр атрымаў заданне...

...Я вельмі добра памятаю ўсе акалічнасці, пры якіх мы даведаліся пра сітуацыю з грашыма і таварамі 1998 года. Проста ў тыя дні мы з жонкай — маладая сям'я — былі за мяжой, у Чэхіі. Курс тагачаснай кроны практычна супадаў з беларускім рублём, таму ў цэнах арыентавацца было вельмі лёгка, а многіх тавараў, што мы бачылі там на паліцах, у нас яшчэ не было, або яны каштавалі нейкіх, на наш погляд, неймаверных грошай. А нам было патрэбна ўсё. Не ад сквапнасці, у нас проста яшчэ амаль нічога не было свайго. Таму мы не толькі і не столькі набывалі прыгожыя і памятныя талеркі — яны былі для нас яшчэ і патрэбнымі ў гаспадарцы рэчамі. А якасць? Уявіце, на тагачасны долар у пераразліку можна было выпіць чатыры келіхі чэшскага піва, а ў краме са зніжкай за той жа «зялёны» ўзяць нават пяць бутэлек!.. Мабільных тэлефонаў тады не было, сувязь з Беларуссю была ў асноўным праз кіраўніка тургрупы. І вось аднойчы гэтая жанчына на наша пытанне, маўляў, як там дома, адказала проста: усё спакойна, з паліцаў крамаў «змялі» ўжо ўсё...

Што было далей, памятаюць усе... Мы жылі на здымнай кватэры, гаспадар катэгарычна адмаўляўся браць плату ў рублях — толькі долары. А іх і да таго было купіць цяжка, ну а ўжо калі ўсё тое закруцілася... Аднойчы нам усё ж удалося перакананць гаспадара ўзяць арэндную плату ў рублях. Дагэтуль памятаю тую суму — 130 долараў за два месяцы, калі мне не здраджвае памяць, паўтары нашы зарплаты. Менавіта столькі — яшчэ па старых цэнах — тады каштаваў айчынны двухкамерны халадзільнік, якога ў нас не было. Мне было шкада не грошай, але вельмі шкада таго халадзільніка, што мы маглі купіць на іх...

Дзеля чаго я ўсё гэта прыгадаў? Зараз з вуснаў многіх не сыходзяць чуткі, што ў крамах дэфіцыт пэўных тавараў, што многія з іх «размялі» па старых цэнах — пакуль ёсць, бо новыя партыі будуць каштаваць непараўнальна больш. Афіцыйна ж сцвярджаецца, што ніякіх праблем няма, наадварот, паўсюдна працягваюцца святочныя распродажы тавараў са зніжкамі, і менавіта гэтым абумоўлены пэўны ажыятаж. Чаго прасцей — трэба перакананцца ва ўсім на ўласныя вочы. А «легенда» будзе простай — будзем шукаць... халадзільнік.

Пятніца, каля 11 гадзін, мінскі «ЦУМ». Мімаходзь кідаю позірк на секцыю з лічбавымі фотаапаратамі: выбар — як звычайна, цэны, падаецца, таксама. У аддзеле посуду на паліцах тыя ж тавары і ў той жа колькасці, што і раней. У секцыі непадалёк — айчынныя сокавыціскалкі па ранейшым кошце (браў увосень), кухонныя камбайны, электрачайнікі. Ніякага ажыятажу. А вось і аддзел па продажы буйной бытавой складанай тэхнікі — тых жа халадзільнікаў, газавых пліт, пральных машын і інш. Тут не тое што нешматлюдна, але і ... нязвыкла пуста. Раней з-за гэтай самай тэхнікі развярнуцца, як кажуць, не было дзе, а зараз шпацыруй сабе, як па праспекце. Прыглядаюся. Ды не, вось жа тавары, нават выбар ёсць. Напрыклад, тры мадэлі імпартных СВЧ-печаў. Але, прабачце, заўважаю ў апошні момант, што на іх цэтлікі: прададзена па безнаяўным разліку. Побач каля пяці мадэляў айчынных печаў — аналагічны цэтлік толькі на адной.

...За спінай чую размову прадаўцоў: «Дзяўчаты, рэшткі халадзільнікаў — па ранейшых цэнах, новая партыя — па новых, канкрэтныя лічбы скажу бліжэй да 13 гадзін». Дзе тыя рэшткі? Пакуль шукаю іх позіркам, заўважаю чатыры айчынныя пральныя машыны, на трох з іх — ужо вядомыя цэтлікі. Два халадзільнікі разам са мной уважліва вывучаюць дзве пенсіянеркі. «Паглядзі, які цудоўны, і толькі крыху больш за 700 тысяч. А гэты велізарны побач — мільён трыста тысяч. Дык гэта ж цэны! А Рыгораўна пад гэтую паніку, удумайся, узяла і купіла сабе халадзільнік за два мільёны!» Кіруюся далей за цікаўнымі сяброўкамі (яны яўна нічога не збіраюцца купляць) да ладнага радочка газавых пліт. І асартыментам, і цэнамі тыя, па ўсім відаць, задаволены. Кідаю позірк увех — свяцільнікаў пад столлю значна меней, на выхадзе мімаходзь, заўважыўшы імпартны халадзільнік за больш чым 2,5 мільёна рублёў, думаю: за такія грошы...

У секцыі з адзеннем на другім паверсе і заходзіць няма чаго — з праходу відаць, што паліцы не пустыя. Здалёк бачна, што не паменела тавараў і ў аддзеле тэлеапаратуры: колькасць мадэляў падаецца ранейшай. Зноў пыгляджаюся. Недзе на пяці з іх — з ВК-экранам, самых вялікіх і дарагіх — знаёмыя ўжо цэтлікі аб продажы па безнаяўным разліку. Відавочна, іх набылі фірмы, бо ў звычайнай кватэры такая грувасткая рэч будзе выглядаць недарэчна. А вось некалькі мадэляў з невялікімі экранамі, на якія я неяк раней звярнуў увагу, — калі ласка, стаяць у свабодным продажы. Цэны на іх, наколькі памятаю, не змяніліся. Да прыкладу, адзін з тэлевізараў (на кухню) каштаваў крыху больш за 700 тысяч рублёў. Шкада, што вострай патрэбы ў ім зараз няма, а ўкладаць грошы ў тэхніку дзеля іх захавання я неяк не хачу. Дарэчы, пачым сёння долар у абменніках, учора ж зарплату далі?

Прабегся па паверхах, дакладваю. Калі ў вакенца нікога, значыць, на ім або шыльда «Тэхнічны перапынак», або «Няма дробных беларускіх грошай». Калі абменны пункт працуе, гэта заўважаеш здалёк па чарзе чалавек з дзесяці. Памятаю, у тую самую згаданую вышэй замежную паездку мы вось таксама чакалі ў чарзе, калі хто здасць якую «зялёную» купюру. Але часу стаяць няма, таму кідаю позірк толькі на курс продажу долара — 2 698 рублёў.

...Шпалеры былі на месцы, дываны, сантэхніка — таксама. На некаторай мэблі былі цэтлікі аб продажы і дастаўцы, але яны і раней на канапах ды сталах назіраліся — такія рэчы набываліся заўсёды.

Ну дык а што «заданне» — халадзільнік? Будзем шукаць. Побач, напрыклад, «Электрасіла». Выбар практычна ўсёй бытавой тэхнікі тут быў значна большым. Зрэшты, як і цэны, паколькі гэта па большасці не «бюджэтныя» варыянты. Але «свайго» халадзільнага агрэгата я не ўбачыў і тут — або дорага, або занадта дорага (хоць, хто б спрачаўся, тыя мадэлі, напэўна, стольккі і каштуюць). Выходжу з крамы ўслед за пенсіянеркай, якая вітаецца, па ўсім відаць, са знаёмай, што побач з крамай рыдлёўкай прыбірае снег. «Зайшла вось спецыяльна паглядзець, што ёсць у крамах, бо паўсюдна кажуць, што паліцы пустыя. Ды не, усё ёсць». Ну, выходзіць, не толькі я адзін выйшаў у «свет», каб проста перакананцца ў гэтым.

Даруйце, «дастаў» ужо я ўсіх гэтым халадзільнікам... Ну, а калі сапраўды «трэба»?.. Прыгадаў, што гадоў колькі таму браў «Сцінол» побач з месцам працы, ды і месяцы са два таму заходзіў у тую краму, калі ён зламаўся і давялося тэрмінова шукаць рамонтнікаў для яго. Усё адно вяртацца ў рэдакцыю — зайду. Не атрымалася. Прыступкі занесеныя снегам, на ўваходных дзвярах ніякай інфармацыі: калі зачыніліся, ці надоўга, не кажучы ўжо — па якой прычыне. Карацей, халадзільнік сабе я так і не «купіў»...

Напрыканцы дазволю сабе невялікую суб'ектыўную выснову на падставе ўбачанага. На маю думку, нельга ні адназначна сцвярджаць, што ёсць нейкі дэфіцыт, гэтак жа як і адназначна аспрэчваць такое выказванне. Усё залежыць ад канкрэтнага пакупніка, яго фінансавых магчымасцяў і памкненняў. Калі згаданая вышэй пенсіянерка, убачаная ў «ЦУМе», была б цалкам шчаслівай ад набыцця халадзільніка за 700 тысяч рублёў, дык, напрыклад, мяне ён не задаволіў бы адназначна. Варыянт за 2,5 мільёна ўжо не падыходзіў мне, а чагосьці сярэдняга па кошцеякасці-вытворцу, як мне гэта ўяўлялася, убачыць не давялося. Хоць мая вандроўка па крамах і была надзвычай імклівай і абмежаванай. Але ці не адсюль у тым ліку і нараджаецца часам пэўная пагалоска? Каб я хацеў «набыць» дарагі тэлевізар з вялікім ВК-экранам, заскочыў бы ўсё ў той жа «ЦУМ», убачыў, што ён ужо прададзены, для мяне гэтая сітуацыя была б чым — дэфіцытам?..

Сяргей СТАРЫНАЎ.

«Такія масавыя і маштабныя зніжкі ў краіне былі ўпершыню»

Афіцыйны каментарый

Сітуацыю адносна шматлікіх чутак пра цяперашні дэфіцыт некаторых прамысловых тавараў у продажы мы папрасілі пракаментаваць прэс-сакратара Міністэрства гандлю Алену КАВАЛЁВУ:

— Гаварыць пра тое, што ёсць нейкі дэфіцыт, было б цалкам няправільным. Як і пра тое, што ён можа быць у далейшым, паколькі ўсе пастаўшчыкі тавараў, самі пастаўкі зараз знаходзяцца пад пільнай увагай Міністэрства гандлю. Што ж да самой сітуацыі... У канцы мінулага года — пачатку сёлетняга ўпершыню ў краіне падчас перадсвяточнага і святочнага гандлю шматлікія зніжкі на тавары набылі такую масавасць і маштабнасць, як ніколі дагэтуль. Прычым, найбольшыя па памерах зніжкі назіраліся якраз на першым навагоднім тыдні. Напрыклад, я сама бачыла днямі ў гандлёвым цэнтры «Сталіца» зніжкі ў буцыку — краме дарагога фірмовага мужчынскага адзення, якія дахадзілі да 70 працэнтаў. Як вы думаеце, яны завабілі пакупнікоў? Павялічылі агульны продаж гэтай крамы? А такія і нішэйшыя зніжкі рабілі шматлікія гандлёвыя арганізацыі. Можна сказаць, што яны сталі лагічным працягам удалага мінулагодняга эксперыменту. Тады многія прадаўцы ўводзілі зніжкі на тавары ў студзені — на ўвесь месяц. І менавіта ў гэты час у іх імкліва павялічваліся аб'ёмы продажу, эксперымент спраўдзіў усе спадзяванні. Дарэчы, зараз праводзіцца маніторынг пакупніцкага попыту і руху грашова-таварных масаў падчас продажу тавараў па зніжаных цэнах. Гэтыя вынікі стануць вядомымі ў найбліжэйшы час. Зніжкі ў некаторых крамах будуць дзейнічаць да канца месяца. Калі вытворца ці прадавец заявіў пра ўдзел у такой акцыі, ён не можа адмяніць зніжкі на партыю тавару, прызначаную для продажу менавіта ў межах гэтай акцыі, ці пераацаніць тавар у бок павелічэння яго кошту. Новая цана, у адпаведнасці з цэнавай палітыкай рэгулявання Міністэрства эканомікі, будзе ўстанаўліваца на новыя яго партыі.

На свае вочы

Калі ёсць цярплівасць і час, то будуць і долары...

Звычайна валютны крэдыт на будаўніцтва жылля я аплачваю за 10—15 хвілін, у залежнасці ад «даўжыні» чаргі. Але паколькі на стаянне ў чэргах у мяне зусім няма ні часу, ні жадання, то крэдыт я імкнуся аплаціць яшчэ да таго моманту, як у банк рынецца «мора» людзей з камунальнымі плацяжамі. Але на гэты раз зусім немудрагелістая аперацыя заняла ў мяне больш за гадзіну.

Учора ў 9 гадзін раніцы, гэта значыць, на момант адкрыцця філіяла «Беларусбанк», у кожным з трох вакенцаў, дзе ажыццяўляліся абменныя аперацыі з валютай, ужо стаяла чарга з дзесятка чалавек. Цяжка ўздыхнуўшы, я ўсё ж такі вырашыла не адмаўляцца ад сваіх планаў і сціпла стала ў яе «хвасце». Як высветлілася пазней, чарга была значна даўжэйшай, таму што многія падстрахоўваліся — «браніравалі» месца адразу да некалькіх вакенцаў. Адказ на пытанне, ці можна набыць долары, аптымізму нікому не надаў: у адной касірскі ў наяўнасці былі 100 долараў, у другой — 250. Зразумела, што яны тут жа былі прададзеныя. У чарзе зашапталіся: «А па тэлебачанні казалі, што да абеду ў банках долары можна купіць, а вось пазней іх набыць ужо праблематычна...» Знаўцы тут жа ўнеслі яснасць: «Яшчэ інкасатары не прыязджалі. Валюту падвязуць а палове 11-й. А зараз давядзецца чакаць, можа, хто-небудзь будзе здаваць долары...»

Прыкладна палова людзей, што сталі ў чарзе, прыйшлі з намерам закрыць ці перааформіць свой рублёвы ўклад. «Калі вы зараз знімеце грошы, то страціце 331 тысячу рублёў. Навошта вам гэта рабіць?»— ушчувала касірка адной наведвальніцы. Але тая была непахісная ў сваім жаданні. Жанчыны ў чарзе раніліся адна з адной, як лепш зберагчы грошы... Зразумела, што пераафармленне ўкладаў займала больш часу, чым звычайныя аперацыі. Затое людзей, якія жадалі здаць долары, прапускалі без чаргі... Але з'яўленне долараў у адным з вакенцаў аўтаматычна стварала праблемы, таму што тут жа на гарызонце з'яўляўся хто-небудзь з суседняй чаргі са словамі «Я тут таксама займаў ці займала». Жанчынка, якая стаяла за мной і паралельна яшчэ ў адной чарзе, ласкава так пацікавілася: «А ці многа вы будзеце браць, калі не сакрэт? Ці хопіць мне? Мне звычайна не шанцуе...» Яна мела рацыю, але толькі напалову, таму што долары скончыліся не на ёй, а на мне. Перада мной адна з кліентак банка набыла 250 і другая — 300 долараў. Прычым яна толькі што адышла ад іншага вакенца, дзе ёй таксама штосьці з замежнай валюты дасталося. Дзякуй Богу, што за валютны крэдыт я расплацілася беларускімі рублямі па курсе. А на маё пытанне наконт наяўнасці валюты пачула: «Дзе на вас набярэшся, калі кожны бярэ па тысячы-паўтары тысячы долараў». «І сапраўды, адкуль у людзей такія грошы?» — падумала я, агледзеўшы чаргу, у якой стаялі пераважна пенсіянеркі. Рызыкну выказаць меркаванне, што дзяжурства побач з абменнікам для многіх з іх — ужо будзённая справа. Магчыма, яны скупляюць валюту па просьбе сваіх дзяцей, унукаў ці, скажам, для суседзяў. Ну сапраўды, адкуль у чалавека, які з 8-9 гадзін раніцы і да вечара знаходзіцца на працы, ёсць час, каб пільнаваць валюту? Але ж такіх «дзяжурных» сёння можна ўбачыць ці не паўсюдна. І калі не скончыцца, нарэшце, гэты ажыятаж, хутка мы зможам убачыць і валютчыкаў. Вельмі спадзяюся, што да гэтага ўсё ж такі не дойдзе. Выходзячы на вуліцу, я сутыкнулася яшчэ з адной хваляй людзей, якія цягнуліся чародкай з прыпынку грамадскага транспарту ў філіял «Беларусбанка». Няўжо таксама па валюту?

Надзея НІКАЛАЕВА.

Спажывецкі попыт

Цэны на тавары ўзрасці не павінны

Зніжэнне курса беларускага рубля выклікала попыт на тавары бытавой тэхнікі. Пыласосы, халадзільнікі, тэлевізары, ЗВЧ-печы... Многія скупляюць многае...

Паводле слоў **Уладзіміра КАРАГІНА, кіраўніка Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і працадаўцаў,** беларускі гандаль пакуль не павышае цэны на тавары. І людзі, разумеючы, што такое становішча рэчаў часовае, кінуліся купляць тавары ў магазінах».

Як расказаў карэспандэнту « Звязды» **загадчык секцыі № 1 ЗАТ МС «Радыётэхніка» Аляксандр ВАРАПАЙ,** амаль усе тавары бытавой тэхнікі, якія меліся ў аддзеле магазіна, ужо падыходзяць пад астатак. Ажыятаж на іх пачаўся з самага новага года. Людзі змятаюць усё: тавары і імпартнай, і айчыннай вытворчасці.

А ў магазіне «Тэхніка ў быце», паводле слоў яго **дырэктара Зінаіды КАЧАН,** за гэтыя дні выкананы ўжо месяцавы тавараварот. «Запас нашага тавару практычна вычарпаны, — кажа Зінаіда Качан. — Але, баюся, каб попыт гэты не павярнуўся бокам: а то людзі, як глянуць, што сітуацыя з беларускім рублём нармалізуецца, то пачнуць вяртаць тавары. А мы назад іх ужо не прымем».

Як расказаў нам намеснік **начальніка Галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама Ігар ЛАГОЙКА,** сітуацыя на беларускіх заводах — вытворцах бытавой тэхнікі ў норме. Пакупнікам турбавацца не варта. Цэны на тавары застануцца на тым жа ўзроўні. Выключэнне складуць толькі тыя з іх, у склад якіх уваходзяць замежныя камплектавыя часткі.

**Ілья

ВАМ АДКАЗВАЕ ЮРЫСТ

Алена ДЗЕВОЙНА

РУБРЫКУ ВЯДЗЕ

Пяцігадовы ўласнік?

Мы з мужам у разводзе. Ёсць сын пяцігадовага ўзросту, які прапісаны ў доме, што належыць мужу. Хацелася б ведаць, ці ёсць у сына якая-небудзь доля ўласнасці на гэты дом і як можна ёю распарадзіцца?

Ганна, *г. Гродна*

Падставы ўзнікнення права ўласнасці грамадзян на жылое памяшканне пералічаны ў артыкуле 102 Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Згодна з гэтым артыкулам, грамадзяне набываюць права ўласнасці на жылое памяшканне ў выпадку будаўніцтва жылога дома, яго часткі, або кватэры; прыватызацыі жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду; прыняцця жылога памяшкання ў спадчыну; афармлення права ўласнасці на жылое памяшканне членам арганізацыі грамадзян-забудоўшчыкаў; перадачы ім жылога дома, кватэры ва ўласнасць замест знесенага жылога дома; перадачы ім жылога памяшкання ва ўласнасць замест страчанага ў сувязі з капітальным рамонтам або рэканструкцыяй жылога дома; здзяйснення грамадзянска-прававых здзелак і на іншых падставах, прадугледжаных заканадаўствам.

Права ўласнасці грамадзян на жылое памяшканне пацвярджаецца праваўстаноўчым дакументам (адпаведным дагаворам, рэгістрацыйным пасведчаннем, пасведчаннем аб праве на спадчыну і да т.п.).

Дзеці не набываюць аўтаматычна права ўласнасці на жылое памяшканне бацькоў на падставе аднаго толькі факта нараджэння ад іх, рэгістрацыі ў гэтым жылым памяшканні і сумеснага пражывання з уласнікам. Аднак яны маюць права карыстання гэтым жылым памяшканнем нароўні з уласнікам. Адчужэнне ўласнікам жылога памяшкання, у якім пражываюць няпоўнагадовыя члены сям'і, дапускаецца толькі са згоды органа апекі і папячыцельства. Пасля смерці бацькі сын будзе з'яўляцца спадчыннікам першай чаргі і будзе мець права на атрыманне спадчыны ў роўных долях з іншымі спадчыннікамі першай чаргі, да якіх адносяцца, акрамя дзяцей спадчыннадаўца, яго бацькі і жонка (муж).

Пасля дасягнення паўналецця сын, калі застанецца зарэгістраваным па гэтым жа месцы жыхарства, набудзе дадатковыя правы, а таксама і абавязкі, як член сям'і ўласніка жылога памяшкання. Так, згодна з артыкулам 116 Жыллёвага кодэкса, акрамя права карыстання жылым памяшканнем, члены сям'і ўласніка жылога памяшкання маюць права без згоды ўласніка ўсяляць у жылыя памяшканні, дадзеныя ім у карыстанне, сваіх няпоўнагадовых дзяцей. Усяленне членамі сям'і іншых грамадзян дазваляецца толькі са згоды ўласніка жылога памяшкання. Уласнік жылога памяшкання і поўнагадовыя члены яго сям'і нясуць салідарную адказнасць па абавязацельствах, звязаных з карыстаннем і ўтрыманнем жылога памяшкання, дапаможных памяшканняў жылога дома і прыдамавой тэрыторыі. Пры адчужэнні або закладзе жылога памяшкання ўласнік павінен будзе атрымаць згоду ўсіх поўнагадовых членаў сям'і, якія пражываюць сумесна з ім і маюць права карыстання жылым памяшканнем.

Штраф і сорам

Газета «Трыбуна працы» і міліцыя Бабруйскага раёна стварылі своеасаблівую Дошку сораму нелегальных гандляроў спіртовымі напоямі.

У адным з нумароў раёнкі з ініцыятывы начальніка Бабруйскага РАУС Аляксандра Кавальчука былі надрукаваны фота сямі жанчын, якія прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасці за незаконны гандаль алкагольнымі напоямі.

Усе яны — жыхаркі розных вёсак Бабруйскага раёна: старэйшай — 79 гадоў, малодшай — 38. За апошнія два гады яны ўсе неаднаразова былі аштрафаваныя на істотныя сумы: ад 175 тысяч да больш за мільён рублёў, з канфіскацыяй алкагольнай прадукцыі. Агульныя сумы штрафаў на некаторых з гэтых жанчын перавышаюць 2 мільёны рублёў. А адна з нелегальных гандлярак была аштрафаваная двойчы за адзін дзень!

Большасць спагнанняў парушальніцамі закона выплачаны, для чаго ў раёне праводзяцца спецыяльныя рэйды. Аднак міліцыя лічыць неабходным, каб увесь раён даведаўся пра гэтых людзей. «Галасы ў розуму і сумлення, — напісаў на ўступе да Дошкі сораму Аляксандр Кавальчук, — страцілі сілу ў пагоні за нажывай».

— Натуральна, ад такіх захадаў будзе плён, — упэўнены начальнік Бабруйскага РАУС. — Гэта ў горадзе можна хыць і не ведаць сваіх суседзяў, а ў вёсках усе людзі ведаюць адзін аднаго. Мы газетную старонку яшчэ памножылі і вывесілі ў грамадскіх месцах. Нелегальныя гандляры алкаголем павінны несці не толькі матэрыяльнае, але і маральнае пакаранне. Няхай ім будзе няёмка і соромна. І няхай жонкі і маці мужчын, якія п'янствуюць, ведаюць, што міліцыя робіць усё магчымае супраць нелегальных пунктаў, дзе іх мужыкі і сыны набываюць алкагольныя сурагаты.

— Мінулы 2008 год у гэтым сэнсе ў Бабруйскім раёне быў цяжкім: ад атручэння сурагатным алкаголем загінулі 7 чалавек (увогуле ў Магілёўскай вобласці больш за 350 чалавек. — **Аўт.**), — расказала журналістка «Трыбуны працы» Валянціна Міліхіна. — Таму патрэбны рашучыя меры. І гэта газетная Дошка сораму, на маю думку, прымусіць задумацца тых, хто імкнецца зарабіць на слабасцях і шкодных схільнасцях людзей.

Ілона ІВАНОВА.

Дакументы на «бацькоўскі» дзень штомесяц падаваць не трэба

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

Са Жлобінскага раёна (адрас жыхарства і прозвішча ў рэдакцыі маюцца) на «гарачую лінію» нашай газеты са сваёй праблемай звярнулася шматдзетная маці. Яна мае законнае права на так званы «бацькоўскі» дзень — адзін вольны дзень у тыдзень, які аплачваецца. І ў самым пачатку з прадастаўленнем гэтага дня на прадпрыемстве, дзе працуе жанчына, ніякіх асабліва клопатаў не ўзнікла.

— У пачатку мінулага года я сабрала ўсе патрэбныя даведкі і загадам па прадпрыемстве мне на ўвесь далейшы год было дадзена права раз на тыдзень карыстацца гэтым самым вольным днём. Што я і рабіла некалькі месяцаў запар. Але потым мяне часова перавялі на іншы ўчастак працы. Замены там не было, так што пра «бацькоўскі» дзень давялося на пэўны час забыцца. Праз некалькі месяцаў, нарэшце, я вярнулася на сваё ранейшае месца працы і, як і дагэтуль, зноў пачала раз на тыдзень браць вольны дзень. А праз нейкі час высветлілася, што гэтыя «бацькоўскія» дні мне не аплацілі. У бухгалтэрыі сказалі, маўляў, няма адпаведнага загаду. А каб яго выдаць, я цяпер павінна штомесяц падаваць у тую ж бухгалтэрыю даведкі са школы, дзе вучацца дзеці, і аб складзе сям'і. Ці правільна гэта? — пыталася ў нас заяўніца.

Даць кампетэнтны адказ на запыт жанчыны мы папрасілі спецыялістаў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. Вось што нам паведамілі.

«У адпаведнасці з артыкулам 265 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь маці (бацьку, апекуну, папячыцелю), якая выхоўвае (які выхоўвае) траіх і больш дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў (дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў), па яе (яго) пісьмовай заяве даецца адзін дадатковы вольны ад працы дзень на тыдзень з аплатай у памеры сярэдняга дзённага заробку ў парадку і на ўмовах, што вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь. Права на прадастаўленне дадатковых вольных дзён можа быць выкарыстана маці (бацькам, апекуном, папячыцелем) або асобна, або ўказанымі асобамі паміж сабой на іх погляд. Умовы прадастаўлення аднаго вольнага ад працы дня ў тыдзень з аплатай у памеры сярэдняга дзённага заробку за кошт сродкаў найманьніка вызначаны Палажэннем аб парадку і ўмовах прадастаўлення аднаго дадатковага вольнага дня ад працы дня ў тыдзень, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 12 снежня 2007 года № 1729. Згодна з указаным Палажэннем, дадатковы вольна ад працы дзень даецца маці (бацьку, апекуну, папячыцелю) пры ўмове, што яна занятая на працы кожны дзень з нармальнай працягласцю працоўнага часу ў тыдзень, устаноўленай у адпаведнасці з артыкуламі 112—114 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, а таксама пры ўмове выхавання і пражывання дзяцей (дзіця-інваліда) у сям'і. У адпаведнасці з пунктам 8 Палажэння, прадастаўленне дня ў тыдзень афармляецца загадам (распараджэннем), які выдаецца на працягу 5 працоўных дзён з дня падачы заявы, на тры месяцы або іншы перыяд каляндарнага года па ўзгодненні паміж некім з бацькоў і наймальнікам. Такім чынам, калі, згодна з загадам, жанчыне ўстаноўлены вольны ад працы дзень у тыдзень на год наперад (напрыклад, пятніца), дык няма неабходнасці падаваць дакументы штомесяц.

Не дапускаецца перанос і суміраванне вольных дзён у тыдзень у мэтах далейшага прадастаўлення іх у сукупнасці. Кампенсацыя за нявыкарыстаны вольны дзень у тыдзень заканадаўствам не прадугледжана».

Пра цечу камунальнікі ўжо ведаюць

З вёскі Родзевічы Лагойскага раёна на «гарачую лінію» ад імя ўсіх пенсіянераў-вяскоўцаў звярнуўся Аляксандр Мікалаевіч Яскевіч. Паскардзіўся на тое, што ўжо другі год запар у двух месцах працякае водаправод, але ніхто нічога не робіць.

— З надыходам мінусавай тэмпературы побач з такімі месцамі стала небяспечна хадзіць, бо рызыкуеш паваліцца на лёдзе. Нядаўна везлі нябожчыка, дык зноў жа былі праблемы для людзей, — казаў нам заяўнік.

Словы вяскоўца мы перадалі загадчыку сектара кантролю кіравання справамі Лагойскага райвыканкама Алене Дэйнар — для высвятлення ўсіх абставінаў справы. Яна звязалася з мясцовымі камунальнымі службамі і старшынёй сельскага Савета, на тэрыторыі якога размешчана вёска Родзевічы. Высветлілася наступнае.

Камунальнікам ніякіх сігналаў ні ад насельніцтва, ні ад старшыні сельсавета адносна прарыву водаправода не паступала. Цеча сапраўды пасля нашага тэлефанавання была выяўлена, аднак, паводле інфармацыі Алены Анатольеўны, назіралася яна толькі апошнія два тыдні.

— Вада ў дамах у гэты час не знікала. Нязручнасці былі ад таго, што яна ад месцаў прарываў бегла па вуліцы і падмярзала пры мінусавой тэмпературы, — сказала Алена Дэйнар. — Праблема будзе вырашана ў бліжэйшы час (размова была колькі дзён таму. — **С. Р.**) паколькі ў гэты момант работнікі камунальнай службы працуюць на больш неадкладных выкліках.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Прамая лінія

ДАЛОЎ КАМЯНІ... І ЦЫСТЫТ, І ПРАСТАТЫТ

(Працяг. Пачатак у нумарах за 24 снежня і 9 студзеня.)

Калі трэба звяртацца да ўролага — расказвае ўсім, хто дазваніўся на нашу медыцынскую «прамую лінію», кіраўнік цэнтра ўралогіі г. Мінска, загадчык кафедры ўралогіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, доктар медыцынскіх навук, прафесар Аляксандр СТРОЦКІ.

☎ — Гомель, Пётр Віктаравіч, 50 гадоў. Два гады таму «выпусцілі» камяні. Цяпер высветлілася, што камень зноў сядзіць у ныркі — 17 мм... Як такое можа быць? Мне цікава, чаму ён зноў утварыўся? Я выконваў усе ўрачэбныя рэкамендацыі.

— Калі мы з вамі адкрыем прычыну ўтварэння камянёў, то, мусіць, трапім у гісторыю... На жаль, сёння практычна немагчыма ўстанавіць прычыны ўтварэння камянёў у канкрэтнага чалавека.

— Але што б вы парэкамендавалі, каб яны не ўтвараліся?

— Пасля таго, як адышлі камяні, вам павінны былі даць адпаведныя рэкамендацыі. У першую чаргу, колькасць сутачнай мачы павінна быць не менш як 1,5-2 літры.

— У мяне нават больш было на працягу года.

— Важныя і дыета, і прэпараты, якія ўрач павінен быў прызначаць у залежнасці непасрэдна ад структуры каменя. Які ў вас быў камень?

— Не магу сказаць...

— Калі ўраты, то іх можна растварацъ блемарэнам, неабходна падтрымліваць pH мачы і ўжываць ежу, у якой утрымліваецца мала пурынаў. Калі ж аксалаты, то тут зусім іншы падыход... Падыдзіце, калі ласка, да свайго доктара, атрымайце адпаведныя рэкамендацыі і старанна іх выконвайце. На жаль, нават выкананне гэтых рэкамендацый не дазваляе пазбегнуць рэцыдываў, паколькі фактараў утварэння камянёў шмат, і ўлічыць іх усе ў канкрэтнага хворага немагчыма.

☎ — Мінск, Ларыса Міхайлаўна. Бацьку 81 год. Год таму яму зрабілі аперацыю на прастаце. І дагэтуль, калі ён проста ходзіць, выдзяляецца мача. Скажыце, можна з гэтым што-небудзь зрабіць?

— Гэта частковае нетрыманне мачы. Звычайна такі стан нават хірургічным шляхам лечыцца дрэнна. Таму мы рэкамендуем мачыцца як мага часцей — кожныя гадзіны-дзве, акрамя ночы, канешне... На ўсякі выпадак, пакажыце бацьку яшчэ раз уролагу.

☎ — Магілёў, Аляксей. Як пазбавіцца ад такога захворвання як баланапастыт?

— Гэта далёка не самае складанае захворванне, якое ёсць ва ўралогіі... У вас цукар у крыві не павышаны?

— Не.

— Ёсць і мазі, і спецыяльныя ванначкі трэба рабіць... Вы звярталіся да ўролага?

— Так. Мне прапісалі нейкую мазь. Урач сказаў, што калі не дапаможа, то зробім аперацыю. Мазь не дапамагла.

— Можа быць і такая сітуацыя. Часам прапануецца аперацыя, асабліва там, дзе развіваецца рубцаванне тканак, звужэнне крайняй плоці.

— Скажыце, а ў Мінску куды можна звярнуцца?

— Ехаць для лячэння гэтага стану ў Мінск абсалютна не варта. Гэта простае захворванне.

— Але ж пагражаюць аперацыяй.

— Адзін са спосабаў лячэння запалення крайняй плоці — абразанне апошняй. Пасля такой аперацыі праблема знікае. Падыдзіце, калі ласка, да загадчыцы ўралагічнага аддзялення Магілёўскай абласной бальніцы Наталлі Іосіфаўны Сімчанкі. Упэўнены, вашу праблему хутка вырашаць.

☎ — Клічаўскі раён, Іван Мінавіч. Ці магчыма трапіць да вас на прыём? Мае быць і рак прастаты, і камень у мачавым пузыры — 40 мм. Быў у Магілёве, але там не зрабілі аперацыю па выдаленні каменя...

— Вам трэба выдаляць камень праз разрэз у мачавым пузыры.

— Але ж мяне паслалі ў анкалагічны дыспансэр у Магілёве, каб там дазволілі аперацыю. А там сказалі, што не патрэбны ніякі дазвол...

— Вазьміце накірунак у Клічаве, пад'ездзе ў абласную бальніцу, да загадчыцы ўралагічнага аддзялення Наталлі Іосіфаўны Сімчанкі, і ваша пытанне вырашыцца.

☎ — Бабруйск, Іван Пятровіч. 72 гады. Запаленне прастаты. Урач прапісаў метылтэстастэрон...

— А навошта?

— Для лячэння прастатыту.

— Запаленчае захворванне гэтым прэпаратам не лечыцца. Лечацца сумежныя праблемы прастаты, напрыклад, парушэнне патэнцыі.

— Не, тут усё нармальна. Урач сказаў: метылтэстастэрон і фурагін здымаюць запаленчы працэс.

— Фурагін — так, а метылтэстастэрон спрыяе паляпшэнню трофікі, можа прымяняцца кароткімі курсамі. Не магу сказаць, ці патрэбны ён менавіта вам. Напэўна, вы гаворыце мне не ўсё, што сказалі доктару. Таму спытайце ў яго, чаму вам прызначылі гарманальны прэпарат. У некаторых выпадках падчас запалення прастаты могуць прызначаць гармоназамяшчальную тэрапію, але не магу дакладна сказаць, ці ваш гэта выпадак.

— І яшчэ. Прачытаў у часопісе «Гаспадар», што пчаліны падмор, раствораны на гарэлцы і настоены два тыдні можа рассмактаць дабраякасную пухліну.

— У медыцыне такога метаду лячэння не існуе. Больш за тое, у медыцыне наогул не існуе такога метаду лячэння, які прывёў бы да поўнага рассмактання дабраякаснай гіперплазіі.

☎ — Магілёў, Алена Іванаўна. Мне 57 гадоў, пакутую ад нетрымання мачы і газаў. Уролагі прызначылі свечкі эстрэол і таблеткі навітрапан. Яны мне не дапамагаюць...

— Вам неабходна падысці ў першую чаргу да гінеколагаў, каб высветліць, ці ёсць у вас апушчэнне пярэдняга і задняга зводу похвы.

— У мяне няма такіх праблем.

— Значыць, вам не патрэбна рабіць аперацыю па пластыцы пярэдняга і задняга зводу. Неабходна абследавацца ва ўролага, зрабіць здымак мачавога пузыра ў становішчы стоячы, здаць аналізы — пасеў мачы на мікрафлору, некаторыя іншыя, пасля чаго ўзяць накірунак у нашу 4-ю гарадскую клінічную бальніцу, што на вуліцы Р. Люксембург, 110 і пад'ехаць на прыём у панядзелак ці сераду. Паспрабуем вам дапамагчы.

☎ — Беразіно, Ігар Якаўлевіч. Пакутую ад хваробы Пейроні. Прапісалі супрацьзапаленчую тэрапію, ін'екцыі лідазы, фітатэрапію, прэпараты трэнтал і німесіл. Аднак развілася выкрыўленне палавога члена. Хірург кажа, што неабходна хірургічнае ўмяшанне... Ці так гэта?

— Калі выкрыўлінне — звыш 30 градусаў, і на працягу года няма прагрэсавання захворвання — працэс стабільны, то такім хворым сапраўды прапануецца хірургічнае лячэнне. Можаце пад'ехаць у Мінскую абласную бальніцу, дзе ёсць андралагічнае аддзяленне, там вам дапамогуць.

Святлана БАРЫСЕНКА і Вольга ШАЎКО.

(Працяг будзе.)

Пісьмо праверыў карэспандэнт

«КУСЛІВЫЯ» ПАСАЖЫРЫ?

Вось які ліст атрымала рэдакцыя ад групы моладзі, што жыве ў гарадскім пасёлку Касцюкоўка (ён уваходзіць у склад Чыгуначнага раёна Гомеля), а ездзіць на вучобу ў ВНУ і сярэднія спецыяльныя ўстановы абласнога цэнтра. Па сутнасці Касцюкоўка з'яўляецца рабочым пасёлкам і знаходзіцца за 12 кіламетраў ад горада. Студэнты ездзяць на заняткі шэсць разоў на тыдзень. Паездка да ўскраіны горада на аўтобусе маршруту № 43 займае пяць, а да яго цэнтра — 15—20 хвілін. Кошт білета ў адзін канец — 500 рублёў, таму ахвотных ехаць на ім — процьма, пішуць студэнты.

«Але аўтобус маршруту № 43 ходзіць адзін раз у гадзіну, і мы мусім ездзіць на маршрутцы, дзе кошт праезду — 1080 рублёў. Да таго ж аўтобус не працуе з 10 гадзін 20 хвілін да 15 гадзін 30 хвілін, і мы вымушаныя ехаць з заняткаў з першай змены і на другую зноў за тыя ж 1080 рублёў. Калі ж з першай змены затрымліваемся з 16 да 18 гадзін, на прыпынку «Універсітэт» у гэты аўтобус не ўбіцца. З другой змены вяртаемся дадому на маршрутцы, бо аўтобус 43 маршруту спыняе работу ў 17 гадзін 30 хвілін.

Пачатак заняткаў першай змены — у 8 гадзін. Аўтобус жа ў будныя дні да 8 гадзін ідзе з Касцюкоўкі толькі ў 7.47 і 8.27, і ў яго не ўбіцца. У суботу аўтобус пачынае працу наогул у 8.05. Праз Касцюкоўку ездзяць і аўтобусы прыгарадных маршрутаў, але там кошт праезду большы, чым у маршрутках. Газета «Звязда», дапамажы нам ездзіць за 500 рублёў, а не за 1080".

Пад зваротам у рэдакцыю — 12 подпісаў, і шкада, што не пазначана ніводнае прозвішча, ніводны канкрэтны адрас. Для таго яны патрэбны былі, каб удакладніць асобныя дэталі, высветліць тыя ці іншыя абставіны справы.

З гэтым лістом я накіраваўся перш за ўсё ў Гомельскі гарвыканкам да начальніка аддзела транспарту, камунікацый і экалогіі Вячаслава Пятрова, і той, азнаёміўшыся з тэкстам, прамовіў: дай укусіць палец — адкусяць і руку.

«Як гэта разумець?» — спытаў карэспандэнт. А так...

Да ліпеня мінулага года з Касцюкоўкі ў Гомель і назад аўтобусы гарадскіх маршрутаў не хадзілі наогул. Пасажыры карысталіся маршруткамі, прыгараднымі і міжгароднімі аўтобусамі. Але на сустрэчах з інфармацыйна-прапагандысцкімі групамі гарвыканкама і адміністрацыі Чыгуначнага раёна Гомеля (тут аповед Вячаслава Пятровіча мы дапаўняем звесткамі з размовы са старшынёй Касцюкоўскага гарпасялковага Савета Людмілы Бердзікулавай, з якой я пагутарыў па тэлефоне) многія жыхары і Гомеля, і Касцюкоўкі ўсё часцей і часцей у поўны голас пачалі ставіць такія пытанні.

Дык вось у ліпені і з'явіўся гарадскі аўтобусны маршрут № 44, канчатковым прыпынкам яго быў у Гомелі Клёнкаўскі мікрараён. Ён густанаселены, але гэта ж — ускраіна абласнога цэнтра. А чаму б не адкрыць яшчэ адзін маршрут, настойвалі людзі, напрыклад, да аўта- і чыгуначнага вакзалаў. Самае тое было б, бо туды не вельмі зручна дабірацца што з прыпынку «Гідрааўтаматыка» (які з'яўляецца першым на ўездзе ў Гомель з Касцюкоўкі), што з Клёнкаўскага мікрараёна. І на гэты раз гарвыканкам пайшоў насустрач пажаданням людзей, адкрыўшы з першага кастрычніка рух аўтобуса 43 маршруту — да аўтавакзала. А гэта — цэнтр Гомеля.

Пасля гэтых аповедаў мне стаў зразумелы той народны выраз: дай укусіць палец — адкусяць і руку. У кантэксце ж звароту групы студэнтаў гэта можа гучаць так: было дрэнна — стала лепш — хочацца ж, каб было найлепей. І што тут казаць: усё — заканамерна, усё — жыццёва. Пастаўленае пытанне, на нашу думку, мае права на існаванне. Гэта — з аднаго боку. З другога ж, трэба ўзважана паглядзець: а ці ёсць магчымасці для рэалізацыі пэўнага кроку, бо, задаволіўшы просьбы адных, можаш нанесці нейкі ўрон іншым. Таму, каб высветліць гэта, у будны снежаньскі дзень мінулага года я і выехаў у 6 гадзін 43 хвіліны з аўтавакзала Гомеля ў Касцюкоўку на аўтобусе «Радзіміч». У ім 20 месцаў для сядзення і 25 для стаяння. Людзей набілася ў яго, так бы мовіць, па самую завязку, але на прыпынках не засталося ніводнага чалавека, які не ўлез бы сюды. Правільна: у цеснаце ды не ў крыўдзе.

Еду назад першым рэйсам з Касцюкоўкі ў 7.27. Кожны, хто ўваходзіць у аўтобус, купляе білет у вадзіцеля, у каго праязны — паказвае яго. Тая ж самая, а можа яшчэ і большая цесната. Але «за бортам» нікога не засталося.

У наступны, таксама будны дзень, паехаў я з Гомеля ў Касцюкоўку ўжо другім рэйсам — у 8.13. Малюнак зусім іншы. Да прыпынку «Вуліца Цімафеенкі» было сем вольных месцаў для сядзення, пасе, што пры адкрыцці новага, 43 аўтобуснага маршруту, улічваліся галоўным чынам наступныя фактары: пасажырапаток і эканамічная мэтазгоднасць, эфектыўнасць новаўвядзення. Што датычыць першага, дык студэнты ў ім займаюць даволі нязначны працэнт. Асноўны ж упор — на рабочы люд. Пад яго і складаліся графікі руху аўтобуса 43 маршруту ў прыватнасці, як патлумачылі мне Вячаслаў Пятроў і Уладзімір Каваленка.

Тым не менш, я не згодны з імі і салідарны з аўтарамі пісьма і некаторымі пасажырамі, з якімі давялося пагутарыць у час тых дзвюх паездак, у наступным. У суботу першы рэйс з Касцюкоўкі можна было б адправіць і раней: хто-нікто ехаў бы і на рынкі Гомеля, і па іншых сваіх справах. У той жа час я не згодны з тымі, хто настойвае на тым, каб 43 маршрут абслугоўваўся, скажам, «Ікарусам», у які ўмяшчаецца больш пасажыраў. Вадзіцель Кірыл Станько казаў, што ніводзін чалавек не застаецца на паўторны рэйс.

А цяпер наконт эканамічнага эфекту для аўтапарка № 6 ад уводу 43 маршруту. Адны страты ад яго! 6270 тысяч рублёў з часу адкрыцця за тры месяцы. Калі пусціць аўтобус большай умяшчальнасці, тыя страты ўзрастуць. У адрозненне ад пасажыраў, якія купляюць праязныя білеты з карысцю для сябе, продаж іх для аўтатранспартнікаў нявыгадны, стратны. Вось такая галаваломка для іх: робіш добрую справу, а яна, як кажуць у народзе, вылазіць бокам. Больш за тое, у аўтапарку асцерагаюцца: дзе гарантыя таго, што змена раскладу руху не выкліча незадавальнення іншых пасажыраў?

І яшчэ. У гарвыканкаме паказалі некалькі лістоў, у якіх людзі прапануюць адкрыць новыя маршруты, змяніць месца прыпынкаў гарадскага транспарту, інтэрвал руху яго і г.д. Напісанае вывучаецца дэталёва, аналізуецца, але ўсе просьбы задаволіць немагчыма. Нягледзячы на тое, што летась горад набыў 33 новыя аўтобусы і 38 тралейбусаў. Застаецца чакаць лепшых часоў?

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Зварот у карпункт

ЧАМУ БАТАРЭІ ТАКІЯ ХАЛОДНЫЯ?

Чытачка «Звязды», якая жыве ў Віцебску недалёка ад цэнтра горада, паскардзілася на тое, што часта батарэі ў яе трохпакаёвай кватэры, толькі «трохі цёплыя». Асабліва холадна ў «дзіцячым» пакоі. А дзяцей у яе двое. У жыллёва-эксплуатацыйны ўчастак яна звярталася па дапамогу некалькі разоў. Але там не вельмі спяшаліся выправіць праблему. Прыходзіў толькі сантэхнік, каб праверыць тэмпературу паветра ў кватэры. Давялося зрабіць гэта і карэспандэнту «Звязды» — «выехаў па выкліку» непасрэдна на месца.

— А я ж, бачыце, вокны з ПВХ паставіла, думала, хоць трохі будзе цяплей у кватэры! — распавядае чытачка. — А калі б былі звычайныя вокны, наўрад ці пры такім ацяпленні «ўтрымлівалі б градусы». А калі б былі яшчэ ў кватэры і цёплыя падлогі, наогул можна было б камунальнікам не паліць? Так? Выходзіць, мы плацім толькі за тэмпературу гарачай вады, што падаецца да дома, а не за тую, што ў батарэях канкрэтнай кватэры? У першы раз, калі я па тэлефоне паведаміла ў ЖЭУ, што батарэі трохі цёплыя, паабяцалі, што прыйдзе «камісія». У выніку прыйшоў толькі сантэхнік. Дакрануўся да батарэй, сказаў, што будуць разбірацца. У другі раз прыйшоў ён жа, але ўжо з градуснікам. Высветлілася — у самым цёплым памяшканні — на кухні — усяго плюс 16 градусаў. А я тады ж там і газавую пліту запальвала спецыяльна.

Зайшлі мы да суседкі чытачкі. Бабуля, каб цёпла было, у валёнках ды паліто па кватэры ходзіць. А яшчэ газ уключае. Пры гэтым «гарманік батарэй» у адным з пакояў амаль што на ўсю даўжыню.

Чытачка па маёй парадзе адправіла ліст у гарвыканкам. Праверана, што калі проста тэлефанаваць ды скардзіцца на тых, хто не прымае меры, — часта гэта не вельмі эфектыўна. Ды і вусны зварот журналіста не заўсёды дае станоўчыя вынікі. Толькі, бывае, горш таму, хто папрасіў прадстаўніка СМІ гэта зрабіць.

— Дзякуй за добрую параду! — сказала чытачка мне праз некалькі дзён. — Не паверыце, калі не памыляюся, у пятніцу адправіла, як вы і параілі заказны ліст, а пасля выхадных ужо да мяне з ЖЭУ прыйшлі, нават начальнік. Падчас іх прыходу батарэі былі гарачымі. Змерылі тэмпературу ў пакоях: цуд — больш як плюс 18. Я не магу сказаць, што заўсёды ў кватэры было холадна падчас новага ацяпляльнага сезона...

Прадстаўнікі ЖЭУ растлумачылі — калі тэмпература ў памяшканнях адпавядае стандарту — плюс 18 градусаў, няважна якая тэмпература вады ў батарэі. Маўляў, неабходнай тэмпературы вада падаецца да дома. І рэгулюецца спецыяльным прыборам у залежнасці ад тэмпературы паветра на дварэ. Якія ж прэтэнзіі? Склалі акт, прапанавалі зрабіць перапразлік за час, калі тэмпература ў кватэры была на два градусы ніжэй за норму. Але гаспадыня адмовілася — папрасіла, каб заўсёды тэмпература была нармальная.

Па каментарый я звярнуўся ў Камітэт дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці. Спецыялісты мне растлумачылі, што насамрэч, калі тэмпература ў жылых памяшканнях плюс 18, у прынцыпе нельга абвінавачваць камунальнікаў. Вядома ж, вокны ПВХ, металічныя дзверы і гэтак далей вельмі спрыяюць павышэнню тэмпературы на некалькі градусаў. Што датычыцца тэмпературы вады ў батарэі, то па просьбе жыльца ў гэтым выпадку пажадана яе праверыць. Мо насамрэч праблема з ацяпленнем звязана з тым, што своечасова не праверылі стан ацяпляльнай сістэмы дома, не «прачысцілі трубы»?

У Камітэце мне параілі, каб я парэкамендаваў чытачцы пісьмова звярнуцца ў адміністрацыю раёна, дзе яна пражывае. Яна пакуль чакае адказу на ўжо адпраўлены ліст. Дарэчы, і ўсім чытачам раю па камунальных пытаннях пісьмова звяртацца ў інстанцыі. І лепш заказным лістом.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Кватэрнае пытанне

Дом здалі. На рамонт?

Вось ужо другі год як мы жывём у новай кватэры, у новым доме. Усё цудоўна... Калі б не тое, што асобныя суседзі дагэтуль вядуць перапланіроўку, пераабсталяванне і аддзелачныя работы — з усімі адсюль наступствамі... Ці ёсць нейкія нормы па тэрмінах засялення ў дамы-новабудоўлі?

Л. К., *Мінск.*

Нормы па тэрмінах засялення жылых дамоў існуюць. Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 лістапада 2005 г. № 565 (пункт 2) вызначана, што мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, іншыя дзяржаўныя органы і дзяржаўныя арганізацыі, у гаспадарчым распараджэнні або аператыўным кіраванні якіх знаходзяцца жылыя памяшканні дзяржаўнага жыллёвага фонду, забяспечваюць засяленне свабодных (вызваленых) жылых памяшканняў у месячны тэрмін пасля прыёмкі іх у эксплуатацыю або вызвалення. У адпаведнасці з падпунктам 1.2 Указа ад 3 чэрвеня 2008 г. № 292 у вышэйзгаданую норму ўнесены змяненні ў наступнай рэдакцыі:

Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, іншыя дзяржаўныя органы і іншыя дзяржаўныя арганізацыі, у гаспадарчым распараджэнні або аператыўным кіраванні якіх знаходзяцца жылыя памяшканні дзяржаўнага жыллёвага фонду, забяспечваюць засяленне свабодных (вызваленых) жылых памяшканняў *у месячны тэрмін пасля дзяржаўнай рэгістрацыі права на зямельны ўчастак і жылы дом*, размешчаны на гэтым участку, альбо іх вызвалення (за выключэннем жылых памяшканняў спецыяльнага службовага жыллёвага фонду, службовых жылых памяшканняў, спецыяльных жылых памяшканняў).

Што датычыцца рамонтных работ, перааабсталявання і перапланіроўкі кватэр, то парадак іх правядзення рэгламентаваны спецыяльным палажэннем, зацверджаным пастановай Урада ад 31 снежня 2006 г. № 1805. І ім, у прыватнасці, забаронена ажыццяўляць работы, якія ствараюць шум або вібрацыю, у выхадныя і святочныя дні, пачынаць такія работы раней чым у 9 гадзін раніцы і заканчваць пазней чым у 19 гадзін у рабочыя дні.

Віктар САВІЦКІ.

Нефармат

Сабачая праўда

Вестка пра трагедыю ў Бабруйску сціпла абышла ўсе сродкі масавай інфармацыі. Дзяўчына засталася інвалідам на ўсё жыццё, бо яе пакусалі бяздомныя сабакі. Паламанае маладое жыццё, перакрэсленыя планы на будучыню, растаптаная мара пра шчасце. Адказваць за гэта няма каму: сабак да адказнасці не прыцягнеш, а людзей, якія не вельмі прытрымліваюцца законаў, у нас колькі хочаш. Амаль ніхто не лічыць сябе абавязаным строга захоўваць правілы ўтрымання сабак: рэгістраваць іх, плаціць адпаведны падатак, прыбіраць за сваім любімцам на вуліцы, як робяць у заходніх краінах, не дапускаць забруджвання жывёлай лесвічных клетак, пад'ездаў. Не кажучы ўжо пра развядзенне сабак байцовых парод, тут працэдура мусіць быць з сямю ступенямі кантролю. Як ні банальна гучыць, але з гэтага ўсё і пачынаецца. Каб утрымання чатырохногага сябра вымагала нейкіх высілкаў, то іншы лішні раз падумаў бы, перш чым завесці сабаку, а потым выкінуць яго на вуліцу, што заўсёды з'яўлялася невычэрпнай крыніцай папаўнення вулічных статкаў. Чалавек адказны за таго, каго прыручыў, сотні разоў гаварылася і пісалася. А калі чалавек не спяшаецца адказваць, яго трэба прымушаць. Каб не паўтараліся трагедыі.

Даўно гэта было ў Брэсце. У элітным мікрараёне таго часу з элітнай школы выйшла дзяўчынка пасля заняткаў у другую змену. Не паспела прайсці некалькі метраў, як на яе накінуўся аграмадны сабака і пакусаў твар школьніцы, параніў канечнасці. Цудам адбілі дзіця прахожыя мужчыны. Тады яшчэ пра падобныя здарэнні не прынята было пісаць у мясцовай прэсе, але вестка хутка разышлася па горадзе. Дзяўчынцы давялося рабіць некалькі пластычных аперацый. Віноватых, як амаль заўсёды бывае ў такіх выпадках, не знаходзілася. Але бацька дзяўчынкі служыў камандзірам падраздзялення дэсантнікаў. І ў адзін з наступных вечароў у раёне школы як з неба звалiліся «невядомыя» хлопцы ў камуфляжы і грыме, і выразалі ўсіх сабак у акрузе. Ніхто пасля гэтага і не пікнуў, хоць у дамах жылі спрэс няпростыя

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (20 снежня) Па гарызанталі: Экслібрыс. Крачка. Палка. Ігла. Тона. Пік. Гну. Адан. Ледакол. Куш. Аорта. Апіс. Пакос. Фрэска. Баклан. Тук. Ярд. Кабала. Ролік. Ачко. Лат. Нага. Матыка. Таган. Трапак. Анагр. Іскра. Лёс. Айсберг. **Па вертыкалі:** Спаніэль. Абарот. Лодка. Каляіна. Акно. Аркан. Санд. Пойла. Аўра. Стакан. Аніс. Лагер. Чарпак. Кок. Агра. Бра. Апука. Ком. Край. Юрта. Каша. Пасталы. Алі. Кулак. Пінгвін. Стаката.

Сканворд (23 снежня) Па гарызанталі: Маштаб. Лібрэта. Душа. Тара. Акт. Спуд. Гак. Раць. Грыб. Сіп. Абрус. Кантата. Пан. Ліпа. Іран. Капітан. Гітара. Сібарыт. Тар. Танкер. Рука. Сага. Хабар. Фуга. Бондар. Зона. Грак. «Капітал». **Па вертыкалі:** Кантракт. Скіт. Сцяна. «Атас». Пара. Сапфір. Герб. Пліта. Тата. Буда. Панда. Фанза. Урад. Нанду. Док. Лішак. Гран. Тур. Сена. Рак. Цір. Збан. Літара. Гарнір. Руб. Пазыка. Узбекістан. Тарантул.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Ракаў наведае цудоўная ідэя, а Цяльцоў чакаюць добрыя навіны

ЎАВЕН. На гэтым тыдні не засмучайцеся па дробязях: аптымізм дазволіць вам змяняць плынь падзей у патрэбным для вас кірунку. Не трэба забываць, што самы просты варыянт выбару — не заўсёды лепшы.

ЦЯЛЕЦ. Час для самарэалізацыі і раскрыцця творчага патэнцыялу. Шукайце новы падыход да праблем, магчыма — новую працу. У панядзелак верагодныя сваркі з сябрамі і адчуванне адзіноты. Серада можа пацешыць вас добрымі навінамі і прывабнымі перспектывамі. У чацвер будзе выгадным дзелавое супрацоўніцтва са сваякамі. У гэты дзень добра вырашаюцца пытанні пазыковых абавязацельстваў.

БЛІЗНЯТЫ. Тыдзень спрыяльны для творчасці, асабліва гэта важна для людзей мастацтва. Аднак падрыхтуйцеся да таго, што ваша жыццё стане прадметам пільнай увагі з боку калег. Вашы адважныя рашэнні могуць прывесці ў захапленне калегаў, але ўвасабляць гэтыя ідэі давядзецца самастойна.

РАК. Гэта выдатны час, калі можаце закладваць аснову будучыні. Будзеце заўважаць цікавыя дэталі, сітуацыі, міма якіх раней праходзілі. У аўторак паспрабуйце падрабязна запісаць цудоўную ідэю, якая наведае вас. У пятніцу, адстойваючы свой, як вам здаецца, адзінаправільны пункт гледжання, прыслухайцеся да слоў апанента: так вы пазбегнеце канфліктнай сітуацыі. У суботу давядзецца прымаць адказныя рашэнні.

ЛЕЎ. З'явяцца новыя магчымасці, пашырацца далягляды, пачнецца або адновіцца рост у прафесійнай сферы. Прыняцце важнага рашэння адкладзіце на тыдзень. Трымайце свае эмоцыі ў аброці.

ДЗЕВА. Прафесійныя інтарэсы і асабістае жыццё будуць цесна пераплятацца — у дзелавых праектах могуць удзельнічаць вашы сябры або сваякі. У аўторак будзьце больш асцярожнымі, маючы стасункі са староннімі: у гэты дзень пажадана кантраляваць не толькі дзеянні і словы, але і думкі, бо яны могуць адбіцца на твары.

ШАЛІ. Час прыходзіць у сябе і рабіць сваю працу, нават калі вам гэтага зусім не хочацца. Паступова эмоцыі ўлягуцца і сітуацыя стабілізуецца. Часам давядзецца займацца аднастайнымі і сумнымі справамі, якія абавязкова неабходна зрабіць. Не засмучайцеся — яны прынясуць вам добры прыбытак.

СКАРПІЁН. Успомніце аб старых сябрах, запросіце іх у госці або хоць бы патэлефануеце. Панядзелак можа прайсці ў стане эйфарыі, але ўжо ў аўторак давядзецца спусціцца з нябёсаў на зямлю. Пажадана прывесці ўсю працоўную дакументацыю ў ідэальны парадак — і вы адчуеце ўнутраную лёгкасць і душэўную раўнавагу.

СТРАЛЕЦ. Калі возьмецеся за будаўніцтва, не брацце ў якасці асноўных матэрыялаў пясок і паветра. Глядзець на жыццё трэба максімальна прагматычна. Паспрабуйце завяршыць усе сур'ёзныя і неадкладныя справы ў аўторак, каб не вяртацца да іх. Вы не пашкадуеце, калі праведзяце выхадныя ў выбраным коле, куды дапусцяць не кожнага.

КАЗЯРОГ. Магчымы актыўны ўдзел сяброў і аднадумцаў ва ўсіх вашых справах. Займіцеся ўласнымі планамі, але не грэбуйце сям'ёй. У панядзелак не варта асабліва спакушацца прапановамі сяброў або партнёраў па бізнэсе — зарабіць не атрымаецца. У пятніцу верагодныя пэўныя трэнні з начальствам з-за розных падыходаў да рашэння неадкладнага пытання.

ВАДАЛЕЙ. Надыходны тыдзень досыць бяспечны, але наўрад ці роўны і спакойны. Давядзецца многае змяніць, палепшыць і асвоіць. Амаль напэўна паўстане шэраг заблытаных праблем, якія давядзецца вырашаць у адзін і той жа час. З аўторка можа пачацца паласа поспехаў. Ваша персона будзе выклікаць павышаную ўвагу.

РЫБЫ. У пачатку тыдня можа звалiцца шмат клопатаў і дробных праблем. Але чым больш бескарыслівай падтрымкі вы акажаце тым, хто жыве ў нястачы, тым больш пазітыўнымі будуць змены ў жыцці. Да дасягнення жаданага выніку застанецца зусім трохі, таму займіцеся самай неадкладнай справай.

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ НАСТУПНЫХ ПАСАД:
— кафедра псіхалогіі і педагогікі: дацэнт, старшы выкладчык;
— кафедра беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры: дацэнт;
— кафедра фізічнага выхавання і спорту: дацэнт, старшы выкладчык, выкладчык;
— кафедра культуралогіі: прафесар, дацэнт;
— кафедра тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументнай сферы: прафесар, дацэнт;
— кафедра менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы: дацэнт;
— кафедра беларускай і сусветнай мастацкай культуры: старшы выкладчык, выкладчык;
— кафедра інфармацыйных тэхналогій у культуры: выкладчык;
— кафедра этналогіі і фальклору: старшы выкладчык;
— кафедра рэжысуры абрадаў і святаў; выкладчык;
— кафедра харэаграфіі: прафесар;
— кафедра народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва: старшы выкладчык, выкладчык;
— кафедра харавога і вакальнага мастацтва: старшы выкладчык, выкладчык;
— кафедра беларускай народна-песеннай творчасці: дацэнт;
— кафедра мастацтва эстрады: дацэнт (2), старшы выкладчык (2).
УНН 100286677

Падведзены вынікі конкурсу на лепшае апавяданне 2008 года

Каля 50 апавяданняў паступіла ў рэдакцыю газеты «Звязда» ў 2008 годзе з пометкай «На конкурс». Апублікавана 22 творы. Некаторыя рэкамендаваныя да публікацыі апавяданні не паспелі выйсці летась, яны будуць надрукаваны ў нашай газеце ўжо ў гэтым годзе.

Пераможцы літаратурнага конкурсу «Звязды» 2008 года:

1-я прэмія — **Віктар ВАРАНЕЦ, г. Гродна** («На бульбе», 2 жніўня).

2-я прэмія — **Віктар СУПРУНЧУК, г. Мінск** (апавяданне «Пад танец ваўкоў», 24 чэрвеня).

3-я прэмія — **Антаніна АБРАМОВІЧ, вёска Старая Мётча Барысаўскага раёна** («Аўгіння», 30 жніўня 2008 г.).

3-я прэмія — **Міхаіл ЗІЗЮК, г. Навагрудак** («Тваё світанне», 2 кастрычніка 2008 г.).

Рэдакцыя газеты «Звязда» выказвае шчырую ўдзячнасць вядомаму беларускаму пісьменніку Віктару Казько, які вёў перапіску з аўтарамі і рэцэнзаваў дасланыя на конкурс апавяданні.

Пераможцаў конкурсу запрашаем у рэдакцыю газеты «Звязда» 20 студзеня 2009 года ў 14 гадзін.

Кантактныя тэлефоны: 287 18 27; 287 19 19.

Да ўвагі ўдзельнікаў штогадовага Літаратурнага конкурсу газеты «Звязда» ў 2009 годзе

Нагадваем, што конкурс на лепшае апавяданне адкрыты для ўсіх — як для прафесійных, «масцітых» літаратараў, так і для пачаткоўцаў.

На конкурс прадстаўляецца адно апавяданне памерам да 5 стандартных машынапісных (або камп'ютарных) старонак.

Просім аўтараў паведамляць колькі слоў пра сябе. Дасылайце, калі ласка, і свой фотаздымак.

Лепшыя апавяданні, дасланыя на конкурс, будуць рэгулярна друкавацца на старонках нашай газеты.

Для налічэння аўтарскага ганарару за надрукаваныя апавяданні ў рэдакцыю неабходна паведамляць наступныя звесткі пра сябе: пашпартныя даныя (нумар, серыю, кім і калі выдадзены, асабісты нумар), месца працы, хатні адрас і тэлефон.

Вынікі конкурсу апавяданняў будуць падведзены ў пачатку 2010 года. Для пераможцаў конкурсу ўстаноўлены:

— першая прэмія — у памеры дзесяці базавых велічынь на момант падвядзення вынікаў конкурсу;

— другая прэмія — у памеры сямі базавых велічынь;

— трэцяя прэмія — у памеры пяці базавых велічынь.

Творы накіроўвайце на адрас газеты «Звязда» з пометкай «На конкурс апавяданняў».

Стыльнае каханне на заселеным востраве

Матор... Знята... Глядзім!

Не засталіся без навагодніх сюрпрызаў і кінааматары. Айчынныя кінатэатры прапануюць пазнаёміцца з прэм'ерамі адразу трох расійскіх хітоў, а таксама з новым фантастычным фільмам, створаным кінамайстрамі ЗША. Сюжэты фільмаў, на жаль, не навагоднія, але заслугоўваюць увагі і, упэўнены, падораць пазітыўны настрой.

Ужо «стартаваў» гістарычны мюзікл рэжысёра Валерыя Тадароўскага **«Стылягі»**. Дзеянне фільма адбываецца ў Маскве ў сярэдзіне 50-х гадоў. Ідэальны прадстаўнік савецкай моладзі Мэлс адкрывае для сябе існаванне другога жыцця. Мэлс і яго новыя сябры вырашаюць змагацца за права быць не такімі як усе, слухаць іншую музыку, па-іншаму апранацца і вядома ж — кахаць.

У ролях занятыя Антон Шагін, Аксана Акіньшына, Максім Матвееў, Ігар Вайнароўскі, Яўгенія Хіры ўская, Сяргей Гармаш, Алег Янкоўскі, Леанід Ярмольнік, Ірына Разанава.

У першы дзень новага года адбылася прэм'ера фільма **«Любовь-морковь-2»**, знятага паводле сцэнарыя вядомага беларускага аўтара Андрэя Курэйчыка. Гэта — сіквел аднаго з галоўных кінахітоў 2007 года, які, кажуць, перавышаў па бюджэце, якасці гумару, нечаканасці сюжэту і павінен стаць галоўнай навагодняй камедыяй.

...Дзесяць гадоў таму муж і жонка Голубевы праверылі свае пачуцці на трывалась, памяняўшыся целамі. Зараз яны — бацька Андрэй і мама Марына, якія выхоўваюць двайнят Глеба і Святлану. Жыццё мужа і жонкі наладжана, кар'ера галавакружная ў абаіх, а дзень распісаны па хвілінах. Яны не разумеюць, што дзеці любяць менавіта жывых сабак, што сябры бацькоў — не лепшая для іх кампанія на дзень нараджэння. Яны забыліся, што каханне і ўвага даражэйшыя за грошы. Каб вярнуць усё на свае месцы, трэба зноў памяняць усіх месцамі, — вырашыў доктар Коган, наведаўшы аднойчы сваіх прыяцеляў Голубевых. А ранкам яны прачнуцца — Глеб і Святлана ў бацькоўскім пакоі, Андрэй і Марына — у дзіцячым...

Рэжысёр — Максім Пежэмскі. У ролях: Гоша Куцэнка, Крысціна Арбакайтэ, Лідзія Вележава, Кірыл Плятнёў, Вольга Арлова, Дзяніс Парамонаў, Аліна Булынка, Андрэй Ургант, Дар'я Драздоўская.

Аматары фантастыкі могуць паглядзець фільм, створаны кінематаграфістамі ЗША **«Дзень, калі Зямля спынілася»**.

Галактычная федэрацыя планет адпраўляе на Зямлю пасланца з папярэджаннем — калі ўрады не спыняць разбуральныя ўмяшанні ў прыроду, планета будзе знішчана. Але зямляне прымаюць прышэльца за агрэсара, і яму даводзіцца хавацца, прыкідвацца звычайным чалавекам.

Рэжысёр — Скот Дэрыксан. Галоўныя ролі ў фільме выконваюць Кіану Рывз, Джэніфер Канэлі, Джон Кліз, Кэці Бейтс.

У аснову сцэнарыя новага фантастычнага баявіка Фёдара Бандарчука **«Заселены востраў»** пакладзены раман братоў Стругацкіх.



2157 год. Расійскі касмічны карабель, пілатуемы дваццацігадовым Максімам Камерэрам, церпіць крушэнне на далёкай заселенай планеце Саракш. Адважнаму астранаўту давядзецца пазнаёміцца з таямнічай краінай, якой кіруюць Невядомыя Бацькі — пяць ананімных уладароў, якія маніпулююць жыхарамі з дапамогай адмысловых выпраменьвальнікаў. Тут Максім сустрэне новых сяброў, нажыве ворагаў, знойдзе каханне, і, мінуючы небяспечныя выпрабаванні, голад, смяротную небяспеку і страты, узначаліць паўстанцкі рух, кінуўшы выклік пяцёрцы прагных кіраўнікоў...

У ролях: Васіль Сцяпанаў, Пётр Фёдараў, Юлія Снігір, Аляксей Сярэбранікаў, Фёдар Бандарчук, Гоша Куцэнка і іншыя.

Вікторыя АЛЯКСАНДРАВА.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ВАРТА ПРЫСЛУХАЦЦА

Кліча лыжня!

Калі вы яшчэ на нейкіх прычынах не купілі лыжы, самы час гэта зрабіць. Аднак пры гэтым неабходна ведаць пэўныя правілы.

● Каб правільна падабраць лыжы, іх трэба паставіць побач з сабою і падняць уверх руку з выцягнутымі пальцамі. У ідэале яны павінны даставаць да кончыкаў лыж. Лыжы могуць быць і карацейшымі, але не ніжэй, чым сярэдзіна далоні.

● Лыжныя палкі падбірайце так: верхні іх канец павінен прыпадаць на вышыню падпахаў.

● Набываючы лыжныя чаравікі, звярніце ўвагу на тое, каб унутры не было няроўнасцяў, а падэшвы былі эластычнымі.

● Не бярыце чаравікі цесныя ці занадта свабодныя — яны мусяць быць па назе. Мераць іх трэба, надзеўшы дзве пары шарсцяных шкарпэтак.

● Калі ж вы набываеце чаравікі без прымеркі, бярыце на адзінда памеры большыя, чым памер вашай нагі.

● Новыя чаравікі можна зрабіць непрамакальнымі, калі змазаць іх спецыяльным саставам. Ён складаецца з трох частак рыбінага тлушчу і адной часткі рыцыны. Перад змазваннем мазь і чаравікі злёгку прагрэйце. Мазь наносьце некалькі разоў, па меры ўсмоктвання. Як толькі скура перастане ўцягваць мазь — больш змазваць не трэба. Падэшву прамачыце цёплым натуральным пакостам.

● Не пакідайце чаравікі сырымі пасля лыжнай прагулкі. Абавязкова прасушыце іх у цёплым месцы, толькі сачыце за тым, каб скура не перасушылася.

● Маленькія дзеці могуць катацца на лыжах у валёнках, калі вы зробіце на лыжах мяккія мацаванні ў выглядзе пятлі са скуры.

● Не купляйце дзецям лыжы навырост — на іх цяжка будзе хадзіць, і ў дзіцяці адпадзе ахвота да лыжных прагулак.

ВАЗЬМІЦЕ НА ЗАМЕТКУ

Пара касцей не ломіць?

З надыходам маразоў мы ўсё часцей уключаем электрычныя абагравальнікі дома і на працы. Аднак не ўсе ведаюць, што гэтыя прыборы небясшкодныя для здароўя.

Вучоныя даказалі, што штучна створаная высокая тэмпература шкодзіць усім нашым органам і сістэмам, пачынаючы са скуры і канчаючы псіхікай.

Калі мы пастаянна пераграваем памяшканне, наша цела таксама павышае тэмпературу, а ў выніку нават здаровы чалавек пачынае звяваць пагаршэнне самаадчування, галаўны боль, з'яўляюцца праблемы са сном, падае імунітэт, парушаецца абмен рэчываў. Асабліва церпяць ад такога падагрэву касуды і сэрца, у гіпертонікаў пачашчаюцца прыступы. Намнога горш адчуваюць сябе і дыябетыкі, а працаздольнасць ва ўсіх рэзка падае. Кажуць, што пара касцей не ломіць. Але гэта пара, а калі паветра перасушанае ад награвальнага прыбора, то ў алергікаў, у тым ліку і скрытых, пачынаюцца праблемы са скурай. Нават мочакаменная хвароба можа перайсці ў стадыю абвастрэння.

Вучоныя лічаць, што тэмпературная зона камфортнасці, гэта калі ў доме плюс 18—20 градусаў. Што ж рабіць, калі з-за моцных маразоў у кватэры сапраўдная лядоўня?

Вядома, давядзецца ўключаць абагравальнік. Толькі сачыце за тэмпературай, не перагравайце і ўвільгатняйце паветра. Іншы раз дастаткова павесіць у пакоі мокры ручнік ці паставіць на падваконне пасудзіну з вадой. Злоўжываць электрычнымі прыборамі для ўвільгатнення медыкі таксама не рэкамендуюць.

-2548-

ДЛЯ ВАШАЙ КАРЫСЦІ

Цёплая кампанія

Сагрэць цела і душу ў халодныя зімовыя дні дапамогуць духмяныя гарачыя напоі з рознымі прыправамі, фруктамі, мёдам і алкаголем.

Грог, пунш і глінтвейн становяцца ўсё больш папулярнымі і ў нас, бо гэта выдатныя, стагоддзямі праверэныя сродкі ад зімовай хандры і прастуды. Прычым для дасягнення максімальнага аздараўляльнага эфекту патрабуецца мінімальная доза.

Грог — самы папулярны напой у Брытаніі, якім клапатлівыя гаспадыні ласуюць сваіх блізкіх, каб тыя не «расклеіліся» ў непагадзь. Гатуюць грог з моцных алкагольных напояў (каньяку і рому), разбаўленых гарачай вадой ці моцным чаем. Гэты эфектыўны сагравальны сродак незаменны пры кашлі і насмарку.

Наш рэцэпт (на 2 порцыі). Змяшайце 75 г каньяку, 20 г мёду, 10 г лімоннага соку. Заліце сумесь 0,5 шклянкі кіпеню, перамяшайце. Калі мёд растане, разліце грог у падагрэтыя высокія шклянкі. Піце маленькімі глыткамі.

Пунш. Не гасне ў туманным Альбіёне слава і іншага «лекара» — пуншу. Гатуюць яго на аснове чырвоных ці белых вінаў, якія ўмацоўваюць імунітэт і карысныя для сасудаў. У склад пуншу абавязкова ўваходзяць розныя духмяныя прыправы. Яны валодаюць антывірусными, антысептычнымі, супрацьзапаленчымі ўласцівасцямі. У напой можна дадаваць розныя лікёры, але ў невялікай колькасці.

Наш рэцэпт (на 8—10 порцый). Падагрэйце сухое белае віно (1 літр). Дадайце 200 г цукру, гваздзіку, карыцу, цэдру лімона і гатуйце на невялікім агні на працягу 2—3 хвілін, не даводзячы да кіпення. Працадзіце, уліце крыху лікёру ці замяніце яго каньяком. Піце гарачым з керамічных кубачкаў.

Глінтвейн. Для гэтага напою ідэальна прыдатныя чырвоныя сухія ці паўсухія віны. Гатуюць яго з дабаўленнем цукру і вострых прыпраў. Глінтвейн аказвае такое ж лекавае ўздзеянне на арганізм, як грог і пунш.

Наш рэцэпт (на 8 порцый). У эмаліраваную пасудзіну ўліце бутэльку чырвонага віна, дадайце цукар, гваздзіку, карыцу, мускатны арэх (на смак), яблык, нарэзаны кубікамі. Давядзіце да кіпення, затым зніміце з агню і дайце настояцца прыкладна 10 хвілін, працадзіце. Падавайце гарачым у высокіх келіхах.

ВЫ ПРАСІЛІ РАСКАЗАЦЬ

Як даглядаць боты з бляскам

Лакавыя боты не рэкамендуецца насіць штодня, тым больш у сырое надвор'е — ад вільгаці і бруду бліскучая паверхня цьмянее і пакрываецца дробнымі трэшчынкамі. Чысціць шчоткай лакавыя боты таксама не варта. Пратрыце іх тампонам, намочаным у малацэ, а потым сухой анучкай. Можна прайсціся па ботах крыху вільготнай анучкай, пасля чаго змазаць тонкім слоем алею і адпаліраваць аксаміткай. Пры такім доглядзе лакавыя боты надоўга захаваюць таварны выгляд.

МАЛЕНЬКІЯ ХІТРАСЦІ

Выручыць аловак

Мяккі графітавы аловак выручыць у многіх выпадках, калі ў доме нешта заядае, скрыпіць, не круціцца і г.д.

Напрыклад, графітам можна аднавіць лёгкасць павароту крана, які пераключае ваду ў ванну ці ў душ, устараніць скрып дзвярных завесаў, колаў цялежкі, палепшыць слізганне кручкоў па металічным карнізе і шмат чаго іншага. А каб палегчыць работу металічнай засцежкі-маланкі, дастаткова проста правесці па ёй некалькі разоў грыфелем мяккага алоўка — графіт нядрэнна паслужыць змазкай.

-2549-

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.24	16.10	7.46
Віцебск —	8.20	15.54	7.34
Магілёў —	8.14	16.01	7.47
Гомель —	8.03	16.05	8.02
Брэст —	8.38	16.27	7.49
Гродна —	8.30	16.35	8.05

Месяц

Поўня.
Месяц у сузор'і Рака.

Імяніны

Пр. *Агафіі, Ігната, Пятра, Яфіма.*
К. *Ады, Дануты, Адрыяна, Рыгора, Яна.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра



...у суседзяў

ВАРШАВА	КІЕЎ	РЫГА	
-2..0°С	-5..-3°С	+1..+3°С	
ВІЛЬНЮС	МАСКВА	С.-ПЕЦЯРБУРГ	
-2..0°С	-2..0°С	0..+2°С	

Дзве даты

10 студзеня

1001 год — у Друцку пабудавана царква Ражства Прасвятой Багародзіцы, якая згадваецца ў летапісных крыніцах як першы хрысціянскі храм на беларускай зямлі.

1569 год — пачаўся Люблінскі сейм, які разглядаў пытанне аб уніі паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Польшчай. 1 лістапада таго ж года ўнія была падпісана. Паводле яе ўмоў, ствараласа новая дзяржава — Рэч Паспалітая. Адмянялася паасобнае абранне караля польскага і вялікага князя літоўскага — іх функцыі з гэтага часу павінны былі сумяшчацца манархам. Да пытанняў агульнай кампетэнцыі адносілася знешняя палітыка. Узаемна дазвалялася свабоднае набыццё зямельнай уласнасці на тэрыторыі абодвух суб'ектаў Рэчы Паспалітай, незалежна ад месца пражывання. У той жа час ВКЛ цалкам захоўвала свой адміністрацыйны апарат, уласнае заканадаўства, судовую арганізацыю, права эмісіі аднолькавай з Польшчай манеты, мытную сістэму, узброеныя сілы, тытул, герб, дзяржаўную пячатку. Мовай дзяржаўных актаў на тэрыторыі княства была старабеларуская.

Цытата дня:

«Невукі падобныя на бубны: робяць шмат шуму дзякуючы сваёй пустаце».

Атон Бетлінгк (1815-1904), нямецкі і расійскі філолаг, акадэмік.

СУСТРАКАЕМ КАЛЯДОЎШЧЫКАЎ

Рытуальная (уяўная) смерць казы сімвалізавала сабой не што іншае, як заканчэнне (смерць) старога года, у якім пажадана было пакінуць усе сямейныя непаразуменні, хваробы, нястачы, беды, людскія крыўды. Ажыўленне казы (яе новае нараджэнне, або перанараджэнне) было сімвалам пачатку новага года, новага жыцця, новых клопатаў, надзей і здзяйсненняў.

Калядоўшчыкі з асаблівай пачцівасцю ставіліся да наведвання тых хат, у якіх мелася моладзь перадшлюбнага ўзросту або гаспадары ўжо рыхтаваліся да вяселля сына ці дачкі, якое будуць спраўляць у Мясаед (час, які доўжыўся ад Калядаў і да Масленкі).

● Разам з тым калядоўшчыкі не абміналі і тыя хаты, у якіх жылі хлопцы-пераросткі, якія па нейкіх прычынах яшчэ не стварылі сваёй сям'і, а таксама хаты, у якіх на выданні была дзяўчына, якая ўжо ці не адзін раз адмовіла сватам, бо «дужа пераборлівая была». Гарэзлівая кампанія хлопцаў увальвалася ў хаты тых хлопцаў і дзяўчат не толькі з казой, але яшчэ і з вялізным паленам. Заснежанае або ўледзянелае палена зацягвалі проста ў хату і кідалі каля печы. Вынесці з хаты яго можна было толькі назаўтра ўдзень пасля багатага выкупу.

● Акрамя павадыра з казой, у склад гурту ўваходзілі: **музыка, механоша, запявала і некалькі «цыганоў»**. Усе ўдзельнікі гурту апраналіся ў вывернутыя кажухі, «цыганы» вымазвалі твар сажай, павязвалі расквечаныя вялікімі кветкамі хусціны, чаплялі на сябе званочкі, розныя бразгалкі або «шархуны». Моладзь, апранутая ў вывернутыя кажухі, нагадвала састарэлых людзей, якім хацелася зазірнуць у кожную хату і павяншаваць гаспадароў з вялікім святочным фэстам.

● У адпаведнасці са старажытнымі народнымі ўяўленнямі, **кампанія пераапранутых калядоўшчыкаў была ні чым іншым, як гуртам душ памерлых продкаў**. Па вёсцы, не абмінаючы ні адной хаты, хадзілі душы продкаў, каб завітаць да кожнага чалавека, кожнай сям'і. Ім трэба было ведаць, як урадзіла ніва, ці не збіраецца хто замуж або жаніцца, каб з гонарам прадоўжыць эстафету свайго роду. Незвычайныя госці — душы продкаў — наведвалі жывых у незвычайны час: на мяжы двух гадоў — старога і новага. Уласна кажучы, **звычэнні дабрабыту калядоўшчыкамі — былі пажаданні душаў колішніх, былых гаспадароў роднай зямлі**. Менавіта таму такім пачэсным і разам з тым доўгачаканым гасцям нельга было адмовіць у падарунках. Надзвычай рэдка здараліся выпадкі, калі бедная або скупая гаспадыня папракала начных гасцей і пакідала іх без падарунка і асаблівай увагі. У такім разе калядоўшчыкі спявалі ў яе адрас песню, словы якой насілі даволі катэгарычны характар.

● У паўднёвых і паўднёва-заходніх рэгіёнах Беларусі калядоўшчыкі вадзілі каня, мядзведзя або бусла, якія таксама ў старажытныя часы выконвалі ролю «медыятара», вобраза-пасрэдніка паміж светам жывых і светам памерлых.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Віншуем з 70-годдзем нашага любага бацьку, дзядулю і прадзеда ***Івана Андрэевіча АСТАПЧЭНЮ****, які жыве ў в. Мяшэтнікі Мастоўскага раёна. Зычым моцнага здароўя, доўгіх гадоў жыцця, заўжды бадзёрага настрою.*

Сем'і Кандратовіч і Астапчэня.

Усміхнёмся!

Дзве сяброўкі:

— Уяўляеш, у доме шмат зламаных рэчаў, вырашыла звярнуцца ў фірму «Муж на гадзіну». Знайшла самы танны варыянт.

— Ну і як, табе ўсё паправілі?

— Якое там! Прыйшоў мужык, сеў на канапу і дзве гадзіны піў піва і глядзеў футбол па тэлевізары!

☺

«Вучыцца, вучыцца і яшчэ раз вучыцца!» на практыцы азначае адзін экзамен і дзве пераздачы.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».

Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.538 Індэкс 63850. Зак. № 107. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12